WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 СТУДЗЕНЯ 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 16
(26624)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПЕРАКАНАНЫ Ў ЗДОЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСІ І ІРАНА КАНЧАТКОВА ВЫРАШЫЦЬ УСЕ СКЛАДАНЫЯ ПЫТАННІ Ў ГАНДЛІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што вялізны патэнцыял супрацоўніцтва Беларусі і Ірана ў поўнай меры пакуль не выкарыстоўваецца. Аб гэтым ён заявіў 28 студзеня на сустрэчы з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран Эсфандзіярам Рахімам Машаі.

«Патэнцыял супрацоўніцтва нашых краін вялізны, але ён выкарыстоўваецца мізэрна, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Перакананы, што ў выніку сённяшніх кантактаў нам удасца канчаткова вырашыць самыя складаныя пытанні, якія датычацца эканомікі, гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва».

Пры гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў падзяку свайму іранскаму калегу за прынятыя ім рашэнні, накіраваныя на актывізацыю двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Іран з'яўляецца традыцыйным гандлёвым партнёрам Беларусі. За 11 месяцаў 2009 года тавараабарот паміж дзвюма краінамі склаў $65,2 млн. Асноўныя артыкулы экспарту — сінтэтычныя валокны, металапрадукцыя, грузавыя аўтамабілі, трактары, калійныя ўгнаенні. У Беларусь імпартуюцца легкавыя аўтамабілі і часткі да іх, фрукты. Перспектыўным напрамкам інвестыцыйнага супрацоўніцтва з'яўляецца ўдзел прыватных іранскіх кампаній у рэалізацыі праектаў на тэрыторыі Беларусі ў галіне капітальнага будаўніцтва і мадэрнізацыі інфраструктуры. Прапрацоўваецца магчымасць узвядзення гасцінічных і жылых комплексаў, стварэння транспартна-лагістычнага комплексу «Прылессе» ў свабоднай эканамічнай зоне «Мінск», будаўніцтва шматфункцыянальнага грамадска-дзелавога і гандлёва-сэрвіснага комплексу «Чэрвеньскі», гандлёва-адміністрацыйнага комплексу «Кейсан». Акрамя таго, у Беларусі працуюць ужо два банкі з удзелам іранскага капіталу.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў падобнасць пазіцый Беларусі і Ірана па ўсіх актуальных пытаннях міжнароднай палітыкі. Супрацоўніцтва дзвюх краін на міжнароднай арэне мае канструктыўны характар, дзяржавы актыўна падтрымліваюць адна адну на выбарах у органы ўстаноў сістэмы ААН. Беларусь і Іран сумесна выступаюць за ўсталяванне справядлівага светаўладкавання, заснаванага на ўмацаванні шматпалярнага свету і захаванні агульнапрызнаных нормаў міжнароднага права.

«Асаблівасць вашага цяперашняга візіту ў тым, што ён — своечасовы. Я лічу, мы зможам абмеркаваць усе праблемы», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да госця. Ён таксама дадаў, што зацікаўлены ў тым, каб «з першых вуснаў даведацца, якая сітуацыя ў Іране, тыя галоўныя праблемы, якія трэба вырашыць дзяржаве ў найбліжэйшы час».

У сваю чаргу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ірана звярнуў увагу на дружалюбны характар адносінаў паміж дзвюма краінамі. «Нашы дзяржавы знаходзяцца ў агульных умовах, у нас агульныя мэты для пашырэння двухбаковых адносінаў і пры гэтым імкненне быць свабоднымі і незалежнымі, — сказаў ён. — Сёння ў свеце Беларусь і Іран вядомы як краіны, якія змагаюцца за сваю незалежнасць і трывала стаяць на гэтай пазіцыі».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НАВУКОВЫЯ РАСПРАЦОЎКІ Ў БЕЛАРУСІ ПАВІННЫ ВЕЛЬМІ ДАСТОЙНА АПЛАЧВАЦЦА

Талент і веды вучоных Беларусі ў гэтым годзе будуць запатрабаваны як ніколі, заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, уручаючы дыпломы дактароў навук і атэстаты прафесараў 25 навуковым і навукова-педагагічным работнікам краіны.

У новым годзе перад усёй краінай стаяць напружаныя і складаныя задачы, адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Гэты год завяршае пяцігодку, і ў гэты няпросты час — а вы ведаеце, што ён няпросты ва ўсім свеце — мы не можам не выканаць тыя абяцанні, якія былі дадзены намі народу. Так атрымліваецца, што ў гэтым годзе нам трэба, вобразна кажучы, скокнуць вышэй за галаву. І без вашага розуму і таленту мы наогул не зможам вырашыць ніякіх задач», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён дадаў: «Я вельмі рады, што ў нас ёсць што прадставіць не толькі свайму народу, але і ўсяму свету».

Прэзідэнт нагадаў, што гэты год — Год якасці. «Трэба разумець, што пасля завяршэння сусветнага крызісу будуць жыццяздольнымі толькі тыя краіны, тыя прадпрыемствы, якія змогуць даць свету самы якасны і танны прадукт, але перш за ўсё — якасны», — падкрэсліў беларускі лідар, звярнуўшы ўвагу на тое, што якасць тавараў і паслуг немагчыма без найноўшых распрацовак вучоных.

Уручаючы дыпломы і атэстаты, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў зале сабраліся сапраўдныя вучоныя, якія зарабілі ступені і званні ўласнай карпатлівай працай. «Праца вучонага — цяжкая і адказная, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я вам па-добраму зайздрошчу і хачу выказаць вам сваю вялікую павагу. Выпадковых людзей тут няма».

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што задача дзяржавы заключаецца не толькі ў тым, каб слова «вучоны» ў Беларусі гучала горда, але і ў падтрыманні навуковых распрацовак, накіраваных на карысць грамадства, у дастойнай іх аплаце. «Асабліва гэта датычыцца тых распрацовак, якія даюць канкрэтны вынік», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Учора з рук Прэзідэнта атрымалі дыпломы дактары біялагічных, геаграфічных, медыцынскіх, педагагічных, тэхнічных, фізіка-матэматычных, эканамічных і іншых навук. Сярод іх — дацэнт стаматалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта Аляксандр Ластаўка, даследаванні якога дазваляюць адкрываць новыя магчымасці для айчыннай хірургіі. Доктар тэхнічных навук Валерый Канстанцінаў распрацаваў новыя тэхналогіі атрымання сплаваў, якія дадуць магчымасць больш эфектыўна працаваць беларускаму машынабудаванню. Доктарам навук стаў, абараніўшы сваю дысертацыю ў Беларусі, і вучоны з Польшчы Барташ Адам Міцкевіч — выкладчык Заходнепаморскага тэхналагічнага ўніверсітэта ў Шчэціне.

«Галоўнае, каб на тым падмурку, які вы заклалі, быў завершаны той будынак, які вы праектуеце на карысць нашаму народу», — на заканчэнне пажадаў дзеячам навукі кіраўнік дзяржавы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

«СПІ НА СВАІМ!»

Адзін з інтэрнатаў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі атрымаў вялікую партыю новых спальных матрацаў айчыннай вытворчасці.

Беларусь і Расія падпісалі пратакол аб умовах пастаўкі нафты

Першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка і віцэ-прэм'ер Расіі Ігар Сечын 27 студзеня дасягнулі канчатковай дамоўленасці аб умовах пастаўкі расійскай нафты ў Беларусь. Аб гэтым паведаміў Уладзімір Сямашка ў размове з беларускімі журналістамі.

Бакі падпісалі пратакол да пагаднення ад 2007 года, якім на працягу папярэдніх трох гадоў рэгуляваліся ўмовы пастаўкі расійскай нафты і падзелу паміж дзвюма краінамі экспартных пошлінаў на нафту і нафтапрадукты. Акрамя таго, падпісаны балансавая даведка па пастаўках нафты, методыка разліку кошту транзіту расійскай нафты праз беларускую тэрыторыю.

Уладзімір Сямашка паведаміў, што аб'ём бяспошлінных паставак нафты ў Беларусь складзе 6,3 млн тон штогод. «Нам удалося даказаць, што ўнутраныя патрэбнасці Беларусі ў нафце складаюць не 5 млн тон, а 6,3 млн тон, без уліку ўнутранай здабычы нафты, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — Цана гэтага пытання — $400 млн».

Ён асабліва падкрэсліў, што дасягнутыя дамоўленасці даюць магчымасць істотна павялічыць агавораную лічбу бяспошлінных паставак нафты за кошт наступных пазіцый. Па-першае, да 1 кастрычніка будуць ацэнены тэмпы росту беларускай эканомікі (а яны могуць скласці па прагнозе ў гэтым годзе 10-11 працэнтаў ВУП), і беларускі бок мае права прапарцыянальна павялічыць квоту бяспошлінных паставак нафты. Па-другое, не будуць абкладацца пошлінай тыя аб'ёмы нафты, якія будуць пастаўлены на беларускія НПЗ, а потым экспартаваны ў Расію ў выглядзе нафтапрадуктаў.

Акрамя таго, Уладзімір Сямашка нагадаў, што ў апошнія гады структура перапрацоўкі расійскай нафты ў Беларусі склалася наступным чынам: палова яе перапрацоўваецца за кошт уласных сродкаў беларускіх прадпрыемстваў, а другая — як давальніцкая нафта расійскіх кампаній. Паводле слоў першага віцэ-прэм'ера, бакі дамовіліся, што для расійскіх кампаній рэжым работы ў Беларусі не зменіцца з умовай, што прадукты нафтаперапрацоўкі будуць вывезены назад у Расію. Адпаведна давальніцкія аб'ёмы расійскай нафты таксама не будуць абкладацца мытнай пошлінай. «Да сённяшняга дня для расійскіх нафтавых кампаній, якія працуюць на беларускім рынку, гэта было вельмі балючым момантам», — падкрэсліў Уладзімір Сямашка.

Умовы, аб якіх удалося дамовіцца, даволі блізкія да таго, якія дзейнічалі ў 2009 годзе, адзначыў першы віцэ-прэм'ер. «Дзякуючы дасягнутым дамоўленасцям бюджэтныя страты Беларусі будуць не такія вялікія, як гэта бачылася яшчэ зусім нядаўна», — дадаў ён.

БЕЛТА.

ПО ПОРУЧЕНИЮ
РУП «МИНСКИЙ ЭЛЕКТРОМЕХАНИЧЕСКИЙ ЗАВОД» (ПРОДАВЕЦ)
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
(ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
ПО ПРОДАЖЕ ТЕХНИКИ:

■ **ЛОТ № 1: Каток асфальтовый ДУ – 47Б** (1989 г.в.).
Начальная цена с НДС – 10 726 200 бел. руб.

■ **ЛОТ № 2: Погрузчик фронтальный ТО – 28** (1989 г.в.).
Начальная цена с НДС – 13 275 000 бел. руб.

Цены снижены на 10 %. Задаток в размере 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.11.2009. Аукцион состоится **09.02.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.02.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Контактные телефоны: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УПРАВЛЯЮЩИЙ ПО ДЕЛУ О БАНКРОТСТВЕ № 74-9Б/2007 МИЩУК А.М. РЕАЛИЗУЕТ ЧАСТЯМИ С ОТКРЫТЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ИМУЩЕСТВО, ПРИНАДЛЕЖАЩЕЕ ДОЛЖНИКУ РУПП «БАРАНОВИЧСКАЯ ФАБРИКА ПОШИВА И РЕМОНТА ОБУВИ»

В состав имущества входят: оборудование для обувного производства, транспорт, компьютерная и офисная техника, токарное оборудование.

Каждая единица (90 единиц) выставляемого на аукционные торги имущества реализуется отдельным лотом на общую сумму 31 100,8 долларов США (без НДС).

Задаток на участие в аукционных торгах 10 % от суммы приобретаемого имущества.

Шаг аукционных торгов: 10 %.

Цена в белорусских рублях определяется на день проведения расчетов по курсу Национального банка Республики Беларусь к доллару США с учетом НДС.

Торги состоятся 05.03.2010 г. в 12.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Богдановича, 11А.

Подробно с реализуемым имуществом и ценой каждого лота можно ознакомиться на сайте Министерства экономики Республики Беларусь **www.economy.gov.by.**

Для участия в аукционных торгах необходимо предоставить копии учредительных документов организации, заверенные в установленном порядке.

Победитель аукциона по каждому лоту определяется в соответствии с максимально предложенной ценой.

Заявки на участие в торгах принимаются до 04.03.2010 г.
по тел./факс (0163) 42 15 79; 42 44 56;
моб. тел. (029) 633 24 90, (029) 824 80 26.

УНП 200166804

ЦУКАР «ПАЦЯЖЭЎ» НА 10 ПРАЦЭНТАЎ

З учарашняга дня ў Беларусі ўведзеныя новыя цэны на цукар-пясок з павышэннем іх узроўню ў сярэднім на 10 працэнтаў.

Паводле звестак Мінэканомікі, новыя рознічныя цэны на цукар-пясок вагавы складаюць цяпер 2350 рублёў за кілаграм, на расфасаваны ў поліэтыленавыя ці папяровыя пакеты па 1 кілаграме — 2570 рублёў. У міністэрстве патлумачылі, што адпаведнае рашэнне прынятае ў мэтах выраўноўвання цэнаў на цукар з сумежнымі дзяржавамі, а таксама ўлічваючы пагаршэнне фінансавага стану цукраперапрацоўваючых арганізацый у сувязі з перапрацоўкай цукру-сырцу, што завозіцца.

Ігар ГРЫШЫН.

МІНТРАНС ПРАПАНУЕ ПАВЯЛІЧЫЦЬ КОШТ ПРАЕЗДУ ГАРАДСКІМ ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРТАМ НА BR100

Пра гэта паведаміў журналістам міністр транспарту і камунікацый Беларусі Іван Шчэрба.

«Тарыфы на перавозкі ў аўтатранспарце не разглядаліся са жніўня 2007 года, у той жа час наша расходная частка з кожным годам расце». Іван Шчэрба праінфармаваў, што ён звярнуўся ва ўрад з такой ініцыятывай і прапанаваў, каб гэта пытанне ўсё ж разгледзелі.

Выпрабавана на сабе

УЧОРА Ў МІНСКІМ КІНАТЭАТРЫ МЯНЕ ЎДАРЫЛІ ГАЛАВОЙ У СЦЕНКУ

А таксама палілі вадой і прадзьмулі ветрам. Карэспандэнт «Звязды» наведаў сеанс 5D-кіно ў сталічным «Цэнтр-відэа»

— Бліжэйшыя білеты на 3-га лютага — засталіся два апошнія!.. — тлумачыла касірка «Цэнтра-відэа» (што ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» пад плошчай Незалежнасці) парачцы закаханых, якія наіўна збіраліся патрапіць на 5D-сеанс проста зараз. Многія мінчане ўжо даведаліся пра навінку і спяшаюцца ўхапіць дэфіцытны квіток. У мяне атрымалася ўзяць на сеанс толькі за тыдзень да яго.

5D-зала адчынілася ў «Цэнтр-відэа» перад самым Новым годам. У ёй — усяго 8 крэслаў, дзве платформы па 4 крэслы. Сеанс цягнецца 4-5 хвілін, але ўражанняў хапае.

— Усе дробныя рэчы з кішэняў выкладайце на столік, трымайцеся за парэнчы, клапан на іх не затуляйце рукой, калі будзе зусім страшна — цісніце на кнопку «СТОП», — інструктуе дзяўчына перад паказам. Некаторым, здаецца, карціць націснуць «СТОП» ужо пасля гэтых слоў!

Выключаецца святло, і вы пачынаеце ехаць на «амерыканскіх горках» (я ўзяў білет на такі сеанс, ёсць яшчэ іншыя — пра прывідаў). І ўжо на першай горцы — калі вас зацягваюць спачатку наверх, а потым рэзка адпускаюць уніз — ты забываешся, што гэта не насамрэч. Дзякуючы спецыяльным акулярам, якія ўсе надзяюць, ствараецца поўнае адчуванне аб'ёму і рэальнасці! Да таго ж, рухомае крэсла паўтарае ўсе змены на экране — трасецца, паварочваецца, нахіляецца!..

Асабліва ўціскаешся ў яго, калі горка абрываецца — і ты ляціш над пусткай, рэзка прызямляючыся на другі бераг. Альбо калі перад вачыма нечакана ўзнікае сценка — у якую ты ляціш і з усяго маху даешся галавой!.. Скажу вам шчыра — адчуванне дыскамфорту на нейкую секунду сапраўды ўзнікае! Да таго ж, сярод спецэфектаў — вада. У парэнчах стаяць клапаны — і калі на экране ты нясешся праз вадаспад — з іх пырскаюць вадой. Два агромністыя вентылятары даюць адчуванне хуткасці — ты сапраўды нясешся па горцы, вецер дзьме табе ў твар! А спецыяльныя шчоткі пад каленямі ляпаюць цябе так рэалістычна, што воблака матылькоў таксама «ажывае». У перспектыве, кажуць, усталююць яшчэ і прыстасаванне, каб пускаць у залу адпаведныя пахі (у іншых краінах ужо так робяць). Выходзіш з залы — як пасля сапраўдных «амерыканскіх горак»!.. Галоўнае — не ўспрымаць гэта як кіно, а памятаць — што гэта, хутчэй, атракцыён, спосаб баўлення часу. Між іншым, залы 5D ужо пачалі з'яўляцца ў іншых беларускіх гарадах — Брэсце **(на фота),** Гродне, Маладзечне, Барысаве. Хоць раз паспрабаваць, што гэта такое, дакладна варта!

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

Фота БЕЛТА.

МАЙ НА ЎВАЗЕ

■ На прагляд не пускаюць дзяцей да 5 гадоў, нецвярозых грамадзян, з ежай і напоямі.

■ Не пусцяць і тых, хто важыць больш за 100 кг — каб не сапсаваць рухомую платформу.

■ Наведванне такіх сеансаў не рэкамендуецца цяжарным жанчынам, а таксама асобам з псіхічнымі і сардэчна-сасудзістымі захворваннямі.

■ Кошт сеансу — 7—9 тысяч рублёў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДОНАЛЬД ТУСК АДМОВІЎСЯ АД ПРЭТЭНЗІЙ НА ПРЭЗІДЭНЦКІ ПОСТ

Прэм'ер-міністр Польшчы і адзін з заснавальнікаў партыі «Грамадзянская платформа» Данальд Туск заявіў, што не будзе выстаўляць сваю кандыдатуру на выбарах прэзідэнта, якія адбудуцца ўвосень 2010 года.

«Я свой выбар зрабіў», — заявіў Туск, не назваўшы пры гэтым імя кандыдата ад яго партыі на пост кіраўніка дзяржавы. Туск удакладніў, што, паводле яго меркавання, ён прынясе больш карысці для краіны на пасадзе прэм'ера. «Я планую застацца на чале ўрада і Грамадзянскай платформы», — паведаміў ён. Паводле меркавання шматлікіх аналітыкаў, Туск меў усе шанцы перамагчы на выбарах дзейнага прэзідэнта Леха Качыньскага. Аднак тыя ж назіральнікі адзначаюць, што па польскіх законах, рэальнымі ўладнымі паўнамоцтвамі валодае кіраўнік урада.

РАЗВОД У РАСІІ ПАДАРАЖЭЕ ЎДВАЯ

У Расіі з 29 студзеня ў два-чатыры разы павялічацца некаторыя мыты на дзяржаўныя паслугі.

Так, развесціся стане ўдвая даражэй — з кожнага з сужэнцаў за скасаванне шлюбу дзяржава будзе спаганяць 400 рублёў, а не 200, як раней.

ЭСТОНІЯ ПАЗЫЧЫЛА Ў ЛАТВІІ РАСІЙСКІ ТАНК, КАБ ПРАВЕСЦІ ВАЕННЫЯ ВУЧЭННІ

Эстонская армія для правядзення вучэнняў пазычыла ў суседняй Латвіі танк, паколькі ўласных у яе проста няма. Прычым танк аказаўся яшчэ і расійскай вытворчасці — Т-55. Як паведамляюць СМІ, яшчэ ў 1999 годзе Польшча прапаноўвала Таліну бязвыплатна прадаставіць пяць танкаў Т-55, аднак эстонцы адмовіліся, паколькі палічылі, што такая тэхніка не падыходзіць да стандартаў НАТА і перашкодзіць ім уступіць у альянс.

Але ў выніку наяўнасць у Польшчы расійскіх танкаў не перашкодзіла ёй стаць членам Паўночнаатлантычнага блока, а вось эстонскія вайскоўцы дагэтуль ходзяць па свеце з працягнутай рукой.

Верагодна, і на гэты раз можна было б абысціся без танка, калі б эстонскае камандаванне не было змушанае неяк праверыць трываласць пабудаваных салдатамі абарончых будынкаў.

НА ГАІЦІ РАЗВІЎСЯ ГАНДАЛЬ ДЗІЦЯЧЫМІ ОРГАНАМІ

Кіраўнік урада Гаіці Жан-Макс Бельрыў расказаў CNN, што незаконны гандаль чалавечымі органамі і дзецьмі стаў адным з пабочных наступстваў землятрусу. Паводле яго слоў, у краіне існуе кантрабанда органаў — як дзіцячых, так і дарослых.

Прэм'ер таксама станоўча адказаў на пытанне аб кантрабандзе дзяцей для ўсынаўлення. Ён распавёў, што ўлады Гаіці спрабуюць працаваць з бяздомнымі дзецьмі і перадаваць іх у сем'і або прытулкі, але на гэты момант іх незаконны вываз і ўсынаўленне застаецца адной з галоўных праблем. Паводле слоў Жан-Макса Бельрыва, дзеці з Гаіці ў выніку трапляюць у ЗША.

У БЕРЛІНЕ АДАБРАЛІ 1,5 МІЛЬЁНА ЕЎРА

У Берліне сярод белага дня невядомы напаў на вуліцы на супрацоўніка арганізацыі «Ісламская рэлігійная абшчына» і адабраў у яго чамадан, у якім той нёс 1,5 мільёна еўра, паведамляе Berliner Zeitung.

Па ўказанні кіраўніка аб'яднання 64-гадовы супрацоўнік павінен быў аднесці гэтыя грошы ў філіял Deutsche Bank. У банку яму, аднак, адмовілі, таму што філіял не займаўся захоўваннем такіх буйных сумаў.

Кур'ер вырашыў вярнуцца, аднак прама перад офісам арганізацыі на яго напаў малады чалавек, збіў з ног і вырваў чамадан. Напад адбыўся на вачах шматлікіх сведак. Адвакат пацярпелага заяўляе, што гэта было дбайна спланаванае рабаванне, у якім былі задзейнічаныя некалькі чалавек. Паліцыя пачала расследаванне. Ні аб паходжанні грошай, ні аб іх прызначэнні нічога не паведамляецца.

ЗАГІНУЎ МАШЫНІСТ

Каля в. Сталовічы (Баранавіцкі раён) на будаўнічым аб'екце машыніст усталёўваў металічныя апоры на аўтакране, каб затым разгрузіць канструкцыі з прычэпа аўтамабіля МАЗ. У гэты час вадзіцель МАЗа даў задні ход, і машыніста зацяснула паміж аўтакранам і аўтамашынай. 51-гадовы мужчына загінуў на месцы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.01.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲1 долар ЗША	2 886,00
▼1 еўра	4 048,48
1 латвійскі лат	5 722,78
1 літоўскі літ	1 173,84
1 чэшская крона	155,15
1 польскі злоты	996,72
▼1 расійскі рубель	95,05
1 украінская грыўня	358,18

Агенцтва Уладзіміра Раўцова

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,3631
UAH	37,6947
1000 BYR	10,5318
EUR	42,5842

Надвор'е

На выхадныя істотна пацяплее

Ужо сёння ўдзень надвор'е ў Беларусі значна палепшыцца, амаль паўсюдна пройдзе невялікі снег, вецер сціхне і стане цяплей, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Маразы аслабеюць да мінус 3—9. У выхадныя ўсталюецца спакойнае слабамарознае надвор'е, калі час ад часу будзе ісці невялікі снег. Уначы ў суботу 6—13, удзень — 2—9. У нядзелю ўначы 5—12, удзень — 1—8.

У першыя дні наступнага тыдня стане яшчэ цяплей. Так, у панядзелак на працягу сутак чакаецца 0—7 марозу, выпадзе мяккі снег, ва ўсходніх рэгіёнах моцныя снегапады, месцамі мокры снег. У асобных раёнах Віцебскай вобласці месцамі мяцеліца, налепанне мокрага снегу, на дарогах моцная галалёдзіца. А вось у заходняй палове краіны ўначы чакаюцца маразы да 10—15 градусаў. У аўторак і сераду пройдзе снег, мокры снег. У аўторак уначы 7—14, удзень — 5—12 марозу. У сераду ўначы 5—12, удзень — 0—7 марозу.

Сяргей КУРКАЧ.

Дзяржаўны інтарэс

ГАЛАНДСКІ АЎКЦЫЁН, ПРОДАЖ ЗА АДНУ БАЗАВУЮ — УСЁ ДЛЯ ПОШУКУ ЭФЕКТЫЎНАГА ГАСПАДАРА

У Брэсцкім абласным тэрытарыяльным фондзе дзяржаўнай маёмасці цяпер шчыруюць над падрыхтоўкай аб'ектаў да продажу на аўкцыёнах, а таксама пераўтварэнні дзяржаўных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы. Пра гэта, і не толькі, наша гутарка з дырэктарам фонду Паўлам МАНЬКО.

— На пачатку скажыце, калі ласка, Павел Паўлавіч, колькі слоў пра вынікі мінулага года і планы фонду дзяржмаёмасці на гэты год.

— Варта зазначыць, што агульнаэканамічная сітуацыя, якая склалася летась, паўплывала на паўнае зніжэнне дзелавой актыўнасці. Гэта не магло не адбіцца на выніках працы. Але свае планы, прагнозныя паказчыкі, практычна ўсе задачы, што стаялі перад намі на пачатак года, мы выканалі. За год былі ўцягнутыя ў гаспадарчы абарот 633 аб'екты нерухомасці, з іх 106 аб'ектаў у малых гарадах вобласці. Ад рэалізацыі акцый і маёмасці ў абласны, раённыя і гарадскія бюджэты паступіла 13 мільярдаў рублёў. Гэта лічба меншая за паказчык папярэдняга года. Але варта падкрэсліць, што прыцягненне аб'ектаў у гаспадарчы абарот, гэта значыць вяртанне іх да жыцця, нельга мераць толькі паступленнем у бюджэт пэўнай сумы грошай. Галоўнай задачай выглядае пошук эфектыўнага ўласніка, які паставіць справу так, што ў рэшце рэшт сродкі паступяць і, магчыма, у дзясятак разоў большыя, толькі іншым спосабам: праз стварэнне працоўных месцаў, адлічэнні ад заработнай платы, адлічэнне падаткаў.

Летась праведзена прыватызацыя 28 дзяржаўных прадпрыемстваў. На іх базе створана 25 акцыянерных таварыстваў. Можна прывесці прыклады такіх адметных прадпрыемстваў, як птушкафабрыка «Дружба» і саўгас-камбінат «Мір» Баранавіцкага раёна, Баранавіцкі камбінат ЖБК і завод ЖБВ у Баранавічах, Белаазёрскі электрамеханічны завод, тры торфапрадпрыемствы вобласці.

А што датычыць планаў, то трэба зрабіць намнога больш, чым летась, менавіта па забеспячэнні эфектыўнага выкарыстання дзяржаўнай маёмасці. А ў выпадку пагаршэння гэтай эфектыўнасці нашай задачай становіцца прыняць меры, у тым ліку і па змене ўласніка альбо акцыянаванні прадпрыемства. Ну і, вядома, застаецца ў планах далейшае прыцягненне ў абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца. Канчатковыя лічбы па продажы аб'ектаў на 2010 год пакуль не сфарміраваныя. А вось па пераўтварэнні дзяржаўных прадпрыемстваў у акцыянерныя таварыствы планы зацвярджаныя: прыватызаваць давядзецца 81 прадпрыемства. З іх 50 прадпрыемстваў сістэмы «Брэстаблсельгасбуда». Падрыхтоўчая работа праведзена, і да канца года будаўнічыя арганізацыі мусяць стаць акцыянернымі таварыствамі. Як і іншыя прадпрыемствы, з якіх 17 належаць да рэспубліканскай формы ўласнасці, а астатнія — да камунальнай.

— У кантэксце пераўтварэння прадпрыемстваў у акцыянерныя таварыствы вы гаварылі пра пошук формы эфектыўнага гаспадарання. Наколькі мне вядома, напрыклад, баранавіцкая птушкафабрыка «Дружба» працуе даволі эфектыўна, нягледзячы на дзяржаўную форму ўласнасці. Якая тады патрэба ў падзеле на акцыі?

— Стварэнне акцыянерных таварыстваў на «Дружбе» і іншых прадпрыемствах з'яўляецца своеасаблівым задзелам на будучыню. Калі з цягам часу для названых прадпрыемстваў спатрэбіцца інвестар, скажам, для ўдзелу ў тэхнічным пераазбраенні, то знайсці яго будзе нашмат лягчэй. Асабліва замежныя дзелавыя людзі ў большасці сваёй аддаюць перавагу супрацоўніцтву з суб'ектамі гаспадарання прыватнай формы ўласнасці, якімі становяцца акцыянерныя таварыствы.

— Ці актыўна практыкуецца ў вобласці продаж аб'ектаў за адну базавую велічыню?

— Так. Мы выкарыстоўваем такую магчымасць для прыцягнення ў гаспадарчы абарот нерухомасці. І перш за ўсё, шырока прымяняем адну базавую велічыню плюс цану за права арэнды зямлі як пачатковы кошт аб'екта на аўкцыёне.

СТАР. 2

У СТАЛІЦЫ БУДЗЕ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ СІСТЭМА БЯСПЕКІ

Аб захаванні тэндэнцыі скарачэння колькасці злачынстваў і зніжэнні цяжкасці наступстваў апошніх міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь Анатоль КУЛЯШОЎ паведаміў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай стану правапарадку ў мінулым годзе.

Летась на тэрыторыі краіны было зарэгістравана крыху больш за 151 тысячу злачынстваў, што на 7 працэнтаў менш, чым у 2008 годзе. Скарацілася колькасць забойстваў, наўмысных цяжкіх цялесных пашкоджанняў, згвалтаванняў, крадзяжоў, у тым ліку з кватэр грамадзян, выкраданняў аўтамабіляў, разбояў, грабяжоў, хуліганстваў. Вырасла раскрыццё злачынстваў. Спынена дзейнасць чатырох злачынных арганізацый, трох бандаў і 25 арганізаваных злачынных груп. Як і ва ўсім свеце ў рэспубліцы працягваўся рост колькасці камп'ютарных злачынстваў — з 1 тысячы ў 2007 годзе да больш як 2 тысяч у мінулым. Раскрыць з іх удалося крыху больш за палову. Пачасціліся выпадкі злачынных замахаў на аб'екты банкаўскай сістэмы, у тым ліку звязаных з гвалтам.

Больш выяўлена злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў і гандлем людзьмі, у тым ліку цяжкіх і асабліва цяжкіх. Канфіскавана звыш 600 кг наркатычных сродкаў і 20 кг псіхатропных рэчываў. Спынены 43 каналы пастаўкі наркотыкаў, ліквідавана 8 падпольных лабараторый па іх вытворчасці. Больш зарэгістравана эканамічных і карупцыйных злачынстваў. Прыняцце прафілактычных мераў спрыяла зніжэнню колькасці бытавых забойстваў і наўмысна ўчыненых цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Знізілася колькасць злачынстваў, учыненых асобамі ў стане алкагольнагаап'янення, а таксама колькасць загінулых у выніку атручэння алкаголем. Рост колькасці злачынстваў, учыненых судзімымі раней асобамі, адбыўся за кошт менш цяжкіх злачынстваў. Знізілася колькасць злачынстваў, учыненых няпоўнагадовымі.

Вырасла колькасць юрыдычных і фізічных асобаў, якія скарысталіся паслугамі Дэпартамента аховы МУС. Цяпер пад аховай міністэрства знаходзіцца звыш 175 тысяч аб'ектаў, у тым ліку 140 тысяч жылых памяшканняў.

Менш зафіксавана дарожна-транспартных здарэнняў і людзей, загінулых у іх. На дарогах загінула 1313 чалавек, што на 248 менш, чым у 2008-м. Выяўлена каля 50 тысяч фактаў кіравання транспартнымі сродкамі ў стане алкагольнагаап'янення. Заведзена 4800 крымінальных спраў за паўторна здзейсненае на працягу года адміністрацыйнае правапарушэнне.

Паводле слоў міністра, істотных змен у грамадскім меркаванні па рабоце органаў унутраных спраў летась не адбылося. Ацэнка насельніцтва ў цэлым застаецца пазітыўнай.

Міністр таксама адказаў на шэраг пытанняў журналістаў.

— Ніводнае з рэзанансных злачынстваў, якія былі ўчынены ў банкаўскіх структурах, не застанецца без увагі... Мы затрымалі, напрыклад, асобаў, у тым ліку прадстаўнікоў Бранскай вобласці, якія займаліся крадзяжамі з банкаматаў у Магілёўскай, Гомельскай абласцях...

— Перспектывы для раскрыцця колішняга выбуху ля Стэлы ў нас ёсць. Мы раскрылі 17 забойстваў, учыненых у 2001, 2002, 2004 і 2007 гадах. Пройдзе час, і зграданае злачынства будзе раскрытае.

— Мне не даводзілася на санкцыянаваных і несанкцыянаваных мерапрыемствах сутыкацца з тым, каб супрацоўнік праваахоўных органаў не дазваляў працаваць журналісту. Мы павінны забяспечыць вам бяспеку, а журналісты — асвятляць мерапрыемства. Павінен быць канструктыўны механізм, каб усе маглі выканаць свае абавязкі...

— Апасацца таго, што з пачаткам дзеяння Мытнага саюза ўзрасце паток крадзеных машын у Беларусі — усё адно, што гадаць на кававай гушчы... Летась у Віцебскай вобласці мы затрымалі чатыры групы па 6-7 чалавек, і даказалі іх дачыненне да 47 крадзяжоў аўтамабіляў. З Расіі аўто накіроўваліся ў нашу краіну, дзе выраблялася падложныя дакументы, ішла перабіўка нумарных агрэгатаў, а потым дарагія машыны перапраўляліся ў Казахстан. Нельга выключаць, што паток аўто, нелегальна ўвезеных у краіну, можа павялічыцца. Аднак мы гатовыя супрацьстаяць асобам, якія паспрабуюць мець такі крымінальны бізнэс.

— Грамадскае меркаванне паказала, што 36 працэнтаў насельніцтва поўнасцю давяраюць міліцыі. Мы не толькі канстатуем такі факт, але прымаем арганізацыйныя і практычныя меры, скіраваныя на якаснае выкананне сваіх абавязкаў службовымі асобамі органаў унутраных спраў. Мы сёння сур'ёзна працуем ад моманту своечасовага выезду на месца ўчынення злачынства і да накіравання справы ў суд... Трэба працягваць фарміраваць пазітыўны вобраз супрацоўніка міліцыі. Што б ні здарылася, нават па рабоце камунальных службаў, людзі ўсё адно, бывае, звяртаюцца ў міліцыю.

— Я — за ўзвядзенне спартыўных аб'ектаў. «Мінск-Арэна» — адзін з найбуйнейшых у Еўропе аб'ектаў, на яго затрачаны сур'ёзныя грашовыя сродкі, і таму праверка не павінна выклікаць здзіўлення... Ніякай справы па частцы раскрадання сродкаў на названым аб'екце мы зараз не вядзём.

— У нас распрацоўваецца праграма бяспечнага горада. Ад розных прадпрыемстваў паступілі праекты па стварэнні ў сталіцы інтэлектуальнай сістэмы бяспекі, якая ўключае ў сябе камеру відэаназірання. Сістэма дазволіць сур'ёзна ўплываць на стан правапарадку ў цэлым, на арганізацыю дарожнага руху, прафілактыку і раскрыццё злачынстваў. Паступілі пэўныя прапановы ад італьянскага, кітайскага бакоў. Мы зацікаўленыя ў тым, каб у сталіцы было найсучаснейшае абсталяванне...

Святлана БАРЫСЕНКА.

«ПАДАТКААБКЛАДАННЕ — ГЭТА МАСТАЦТВА АСКУБВАЦЬ ГУСАКА, ДАБІВАЮЧЫСЯ БОЛЬШАГА ПУХУ ПРЫ МЕНШЫМ ПІСКУ»

З пачаткам новага года ў краіне пачало дзейнічаць некалькі новых заканадаўчых актаў, якія значна змянілі ўмовы дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, — гэта і Асаблівая частка Падатковага кодэкса, і ўказ Прэзідэнта аб праверках, а таксама стварэнне Мытнага саюза паміж Расіяй, Беларуссю і Казахстанам. Для таго, каб расказаць прадстаўнікам малога і сярэдняга бізнэсу пра новыя ўмовы гаспадарання, у будынку адміністрацыі Ленінскага раёна горада Мінска прайшоў так званы «інфармацыйны дзень», дзе прадстаўнікі кампетэнтных арганізацый пазнаёмілі бізнэсменаў са зменамі кожны ў сваёй сферы.

Хоць тэма сустрэчы павінна была канцэнтраваць увагу на 2010 годзе, **Віктар ЯГОРАЎ, намеснік начальніка ўпраўлення падаткаабкладання арганізацый ІМПС па горадзе Мінску** вырашыў пачаць расказваць пра апошнія змены ў падаткаабкладанні здалёк:

— У нашай краіне з 2006 года ідзе рэформа падатковай сістэмы, уся пяцігодка была накіраваная на такую добрую мэту, і сёлета прынятыя даволі сур'ёзныя змены. Нагул мы пачалі будаваць сваю падатковую сістэму з 1992 года, пасля развалу Савецкага Саюза, практычна на пустым месцы, і тое, што мы пабудавалі, як паказвае практыка, трэба рэфармаваць. Ёсць дзве асноўныя мэты рэформы — знізіць падатковы ціск на беларускі бізнэс і спрасціць падатковае заканадаўства. Калі працэс зніжэння падатковай нагрузкі вельмі балючы, бо прама б'е па даходах бюджэту, то спрашчэнне падатковага заканадаўства падтрымліваецца ўсімі падаткаплацельшчыкамі.

— Яшчэ французскія філосафы ў XVIII стагоддзі далі азначэнне тэрміну «падаткаабкладанне». Яны сказалі, што «падаткаабкладанне — гэта мастацтва». Так што вы таксама можаце сябе прылічыць да людзей мастацтва, бо вы таксама займаецеся пытаннямі падаткаабкладання, — звярнуўся Віктар Ягораў да прадпрымальнікаў і працягнуў: — Але калі дагаварыць гэтае азначэнне да канца, то яна будзе гучаць так: «Падаткаабкладанне — гэта мастацтва аскубваць гусака, дабіваючыся большага пуху пры меншым піску». Гэта значыць узяць падаткі так, каб плацельшчык не абураўся, не пакутаваў, а можа нават наадварот атрымаў асалоду ад усведамлення таго, што ён паляпшае дабрабыт краіны (Аўтар выказвання — Ж. Кальбер, міністр фінансаў Францыі, але жыў ён у XVII стагоддзі. — **Аўт.**)

Віктар Ягораў перайшоў да новаўвядзенняў 2010 года. Прынамсі, ён нагадаў прадпрымальнікам, што адмененыя падатак з продажаў, збор за паркоўку, адбыліся змены па вылічэнні падатку на прыбытак, а таксама на 2 % павысіўся падатак на дадатковую вартасць.

Наогул Віктар Ягораў заўважыў, што «мы імкнёмся стварыць сучасную падатковую сістэму, але нас вельмі крыўдзяць меркаванні замежных экспертаў наконт нашай падатковай сістэмы, яны ўжо другі год прызнаюць яе першай у свеце па складанасці падатковага заканадаўства...».

Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў патлумачыў прысутным, што гаворка ідзе пра 183-е, апошняе месца, па прастаце выплаты падаткаў згодна з рэйтынгам Doing Business 2010, з чым Віктар Ягораў пагадзіўся.

— З аднаго боку, апошняе месца, з другога — першае, але па складанасці. Можа, нам гэтым ганарыцца трэба? — відаць, пажартаваў Віктар Анатольевіч, і дадаў напрыканцы, звяртаючыся да прадпрымальнікаў: — Плаціць падаткі закладзена ў самой прыродзе чалавека, ад гэтага нікуды не падзецца, а наша мэта — абслужыць гэтую вашу патрэбнасць.

Данута РЫЖЫКАВА, начальнік аддзела па каардынацыі кантрольнай дзейнасці Камітэта дзяржкантролю звярнула ўвагу прадпрымальнікаў на некаторыя аспекты 510-га Указа Прэзідэнта «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Яна расказала, што кардынацыйныя планы кантрольнай дзейнасці фарміруюцца да 15 снежня, яны загадзя даступныя і кожны ахвотны можа з імі азнаёміцца на сайце Камітэта дзяржкантролю **(http://www.kgk.gov.by/):**

— Новыя аб'екты ў план не ўключаюцца, і калі вы паглядзелі і вас там няма, то можна не турбавацца, што раптам з'явіцеся, — сказала Данута Эдуардаўна, аднак удакладніла, што ўсё-ткі змены могуць быць унесеныя ў планы, кожны чацвер спіс абнаўляецца, але ў асноўным змены датычацца адмену ці пераносу праверак.

Цікава, што ў першы дзень, калі 15 снежня на сайце Камітэта дзяржкантролю з'явіліся каардынацыйныя планы праверак, на сайт зайшло 15 тысяч наведвальнікаў. А, напрыклад, у чацвер на тыдзень раней наведвальнікаў было толькі 550. Усяго ж за гэты час з планам праверак у інтэрнэце азнаёміліся каля 80 тысяч наведвальнікаў. Але незалежна ад таго, шукаў прадпрымальнік сябе ў спісе на сайце або не, калі яго запланавана праверыць, то за 10 дзён да пачатку праверкі ён павінен атрымаць паведамленне з поўным спісам пытанняў, якія будуць правярацца. Данута Рыжыкава нагадала, што калі вас праверылі, а потым яшчэ раз хочуць праверыць па гэтых жа пытаннях, то вы накіроўваеце акт папярэдняй праверкі, і кантрольны орган павінен будзе або змяніць пытанні праверкі, або скараціць іх.

Таксама ў 510-м Указе напісана, што кантрольныя органы могуць прыйсці толькі ў той месяц, які пазначаны ў плане.

— Калі, скажам, праверка запланавана на студзень і да вас нехта не дайшоў, то ў лютым ён ужо прыйсці не мае права, — сказала Данута Эдуардаўна.

Варта памятаць, што калі раней суб'ект гаспадарання маглі праверыць і за 8, і за 10 гадоў, то цяпер праверка праводзіцца за перыяд, што не перавышае 3 каляндарных гадоў. Прычым суб'ект, які правяраецца, прызнаецца добрасумленным, пакуль не даказана адваротнае. А ўсе недакладнасці ці незразумеласці заканадаўства павінны трактавацца на карысць арганізацыі.

Што датычыцца пазапланавых праверак, то калі раней падставай для іх пачатку маглі стаць звесткі пра парушэнне заканадаўства, не важна, якім чынам атрыманыя, то цяпер такія дадзеныя павінны быць дакументальна пацверджаныя.

— Сёння найбольш запатрабаванымі падставамі для праверак будуць выкарыстанне бюджэтных сродкаў, мераў дзяржпадтрымкі, удзел у дзяржпраграмах. Калі карыстаешся бюджэтнымі сродкамі, то будзь ласкавы даць справаздачу. А ў астатнім — жорсткія ўмовы для падстаў праверкі. Па ананімных зваротах грамадзян праверкі забароненыя, а калі грамадзянін настойвае на праверцы і прыводзіць важкія аргументы, то ён павінен быць гатовым даць паказанні сведкі ў судзе.

І напрыканцы Данута Рыжыкава звярнула ўвагу бізнэсменаў, што змяніўся парадак абскарджвання праверак. Сёння скардзіцца трэба кіраўніку ці вышэйстаячай арганізацыі таго органа, які назначыў праверку. І не зацягваць, бо на абскарджванне даецца толькі 10 дзён.

Напрыканцы мінулага года і ў пачатку гэтага ў суб'ектаў гаспадарання было дый яшчэ застаецца шмат пытанняў наконт Мытнага саюза з Расіяй і Казахстанам. Патлумачыла сітуацыю **Іна ХАРЛАМЯНКОВА, намеснік начальніка Упраўлення тарыфнага рэгулявання і мытных плацяжоў Дзяржаўнага мытнага камітэта:**

— Пачну з таго, што на сёння мы пакуль яшчэ знаходзімся ў стадыі фарміравання Мытнага саюза, і рашэнне аб тым, што тэрыторыі дзяржаў Расіі, Беларусі, Казахстана будуць аб'яднаныя ў адзіную мытную тэрыторыю, будзе прымацца на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў пасля выканання пэўных умоў, прапісаных у пагадненні аб адзіным мытна-тарыфным рэгуляванні. На сёння ў нас пакуль толькі ўведзены адзіныя стаўкі мытных пошлін у дачыненні да тавараў, што ўвозяцца на тэрыторыю краін-удзельніц. А як толькі будзе прынятае рашэнне аб аб'яднанні ў адзіную мытную тэрыторыю, тады пачнецца свабоднае перамяшчэнне тавараў, — патлумачыла Іна Харламянкова.

А што датычыцца стаўкі ўвазных мытных пошлін, вызначанай 699-м Указам Прэзідэнта, то, як сказала Іна Харламянкова, з 1 студзеня яны не прымяняюцца, бо цяпер ва ўсіх трох краінах дзейнічае Адзіны мытны тарыф.

Павел БЕРАСНЕЎ.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41 ПРАРЫЎ ЛІКВІДАВАНЫ...

З вёскі Карацк Клецкага раёна ўчора патэлефанавалі ўсхваляваныя бацькі: быццам бы ў мясцовых базавай школе і садку, што размяшчаюцца побач і маюць агульную сетку ацяплення, зараз холадна з-за прарыву трубы, які здарыўся раніцай. Паводле слоў заяўнікаў, у класах у школе тэмпература паветра была не вышэйшая за 10 градусаў цяпла, у садку, напрыклад, у гульнявым пакоі, не ўзнімалася вышэй за плюс 10—12 градусаў.

На жаль, да кіраўніцтва Карацкай базавай школы бліжэй да вечара дазваніцца ўжо не атрымалася. Аднак слухаўку зняла загадчыца дзіцячага садка Зоя ЗАЛЯСОЎСКАЯ. Яна ў пэўным сэнсе змагла патлумачыць нам сітуацыю. Сапраўды, раніцай прарвала трубу, аднак усе патрэбныя рамонтныя работы, як мы і меркавалі, ужо завершаны. Дзеткі ад марозу, як гаварылі нам бацькі, не пацярпелі: пакуль у памяшканнях заставалася цяпло, яны паспелі паабедаць, а потым іх адправілі па дамах. Да наступнага іх вяртання тэмпература ў памяшканнях будзе адпавядаць нормам.

Аднак, вяртаючыся да званка бацькоў, пытанне яны ставілі некалькі больш шырока. У прыватнасці, гаварылі не столькі пра згаданы канкрэтны эпізод з прарывам трубы, а больш пра тое, што быццам бы такія здарэнні адбываюцца дастаткова часта. Таму ж будынку школы, даводзілі заяўнікі, ужо 40 гадоў. Сеткі прагнілі, іх трэба мяняць, а ніхто нічога не робіць. Маўляў, дапамажыце разабрацца.

Аднак тая ж ужо названая Зоя Мікалаеўна, загадчыца дзіцячага садка, здзівілася такой пастаноўцы пытання бацькамі. Паводле яе слоў, прынамсі, сёлета ніякіх праблем з ацяпленнем не ўзнікала. Да таго ж, пэўныя ўчасткі трубы сеткі ацяплення некалькі разоў за апошні час замяняліся — гэта дакладна.

Гэтыя словы пацвердзіў і начальнік аддзела адукацыі Клецкага райвыканкама Анатоль КЛІМОВІЧ.

— У 9 гадзін раніцы адбыўся прарыў цепласістэмы. Туды адразу была накіраваная брыгада рамонтнікаў і бліжэй да абеду ўсё было ліквідавана, — патлумачыў Анатоль Мікалаевіч. — Адказваючы на заклапочанасць бацькоў увогуле, зазначу, што ад кацельні ідуць дзве веткі: асноўная да школы, і невялікая — метраў на 20—25 — да дзіцячага садка. Першая ветка гады два таму была заменена практычна на 100 працэнтаў. Прарыў адбыўся якраз на гэтым невялікім участку, што ідзе да садка, прычым, упершыню. Ну што ж, калі ўзнікла такая праблема, відавочна, давядзецца мяняць і гэтыя 20—25 метраў. Натуральна, не цяпер, а летам, калі можна будзе весці земляныя работы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МАЗЫРСКІЯ АЎТАСТРАСЦІ

ХАЦЕЎ АДАГРЭЦЬ МАШЫНУ... І СПАЛІЎ ДЗВЕ

Жыхар Камянца хацеў адагрэць у гаражы свой аўтамабіль, які замерз і не заводзіўся. Дзеля гэтага выкарыстаў паяльную лямпу. Але агонь хутка ахапіў машыну, а затым і другую, якая знаходзілася побач. Абедзве машыны знішчаныя. Пажар прычыніў таксама сур'ёзны ўрон гаражу, пацярпела і гаспадарчая пабудова.

ЯК БОМЖ У МАРОЗ ГРЭЎСЯ

Чалавек без пэўнага месца жыхарства не на жарт спалохаў жыхароў брэсцкай шматпавярхоўкі і нарабіў клопату пажарным. Гарадскі бомж нейкім чынам прабраўся ў падвальнае памяшканне дома па вуліцы Куйбышава і ратаваўся там ад марозу. Хоць у падвалах і не мінусавая тэмпература, бяздомнік распаліў вогнішча. І дым стаў паднімацца ўверх, запоўніў памяшканні двух пад'ездаў, пачаў пранікаць у кватэры. Нарад пажарна-выратавальнай службы, што прыбыў на выклік, хутка вызначыў крыніцу задымлення і «папрасіў» віноўніка на вуліцу.

Яна СВЕТАВА.

Абзац

◢ Урачам — маладым спецыялістам, якія прыбылі летась на першае месца працы, выдзелена для пражывання 243 індывідуальныя дамы. У Мінскай вобласці маладым урачам прадастаўлена 97 дамоў, Гомельскай — 40, Віцебскай — 36, Гродзенскай — 27, Магілёўскай — 25, Брэсцкай — 16 і ў Мінску — 2 дамы.

◢ **Праваахоўныя органы праводзяць праверку па факце смерці сям'і са Стоўбцаў. Целы мужчыны і жанчыны без бачных знешніх пашкоджанняў былі выяўленыя ў кватэры. Папярэдняй прычынай смерці лічаць атручэнне чадам. Вядзецца праверка.**

◢ Грамадзянін Украіны загінуў у ДТЗ у Горацкім раёне. Трактарыст, выязджаючы на галоўную дарогу, не саступіў БМВ. У выніку сутыкнення адзін з пасажыраў легкавога аўтамабіля атрымаў траўмы і быў шпіталізаваны, а другі, грамадзянін Украіны, загінуў на месцы. Як лічаць у ДАІ, хутчэй за ўсё, трактарыст не заўважыў БМВ з-за замерзлых вокнаў. Таму спецыялісты раяць выкарыстоўваць спецыяльную вадкасць для ачышчэння шкла ад наледзі.

◢ **Беларускія памежнікі ўвайшлі ў становішча двух парушальнікаў беларуска-літоўскай мяжы. Прыкметы парушэння мяжы былі выяўленыя з верталёта памежнікамі Смаргонскага атрада. У хуткім часе ў раёне населенага пункта Цішканы затрымалі двух жыхароў Літвы, родных братоў. Яны парушылі мяжу, каб трапіць на пахаванне бацькі. Як парушальнікаў іх пакаралі, аднак увайшлі ў становішча затрыманых і выпісалі ім аднадзённыя візы, якія даюць права на законнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы. У экстранных выпадках, раяць спецыялісты, неабходна ў пункце пропуску прад'явіць міжнародную тэлеграму, і на гэтай падставе будзе выдадзеная віза.**

◢ Украінец, які засеў у фортцы ўласнай кватэры, замерз насмерць. Пры спробе патрапіць дадому праз фортку 28-гадовы жыхар Вінніцкай вобласці засеў і замерз. Яго ў непрытомным стане знайшла маці і выклікала «хуткую дапамогу». Аднак дастаўленага ў рэанімацыйнае аддзяленне мясцовай бальніцы з агульным абмарожаннем маладога чалавека медыкам выратаваць не ўдалося.

Поўны абзац

◢ **Незвычайная акцыя пад лозунгам «Спорт — у масы!» прайшла ўчора каля сцен мэрыі Кіева. Абураныя станам тратуараў і дарог у горадзе кіяўляне залілі імправізаваны каток перад уваходам у будынак гарадской адміністрацыі з тым, каб чыноўнікі таксама маглі пакатацца на каньках побач з працай. Вадой была таксама залітая тэрыторыя каля аўтамабільнага заезду ў двор гарсавета. Такім спосабам арганізатары акцыі вырашылі аддзячыць сталічнага гараданачальніка і яго каманду за наладжаны кіяўлянам суцэльны каток у гарадскіх дварах, на тратуарах і дарогах. У сталічнай мэрыі прызналі той факт, што з наступленнем маразоў і снегападаў камунальныя службы не спраўляюцца са сваімі прамымі абавязкамі. Кіраўніцтва гарадміністрацыі паабяцала зрабіць перапразлік па плацяжах за ўтрыманне прыдамавой тэрыторыі ў студзені.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

І ЗНОЎ ТУРМА

56-гадовы жыхар в. Старое Сяло (Брэсцкі раён) быў у роспачы, калі ўбачыў, што з клетак знікла 11 трусоў. Мужчына заявіў пра гэта ў міліцыю, і аператыўнікі вылічылі злодзея. Трусоў выкраў жыхар в. Скокі, які ўжо адседзеў за крадзеж.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ДЗЕВЯЦІКЛАСНІЦА ВЫКРАЛА... ЛАК ДЛЯ ПАЗНОГЦЯЎ,

а таксама залаты ланцужок і шакаладку з прыватнага дома ў Добрушы. Дзяўчынка забралася ў пакой праз незачыненую фортку. Службовы сабака знайшоў малалетнюю зладзейку па гарачых слядах.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3» – продавец (организатор аукциона) 05 февраля 2010 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества с понижением начальной цены продажи на 50 %.

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Баня Забор ж/б панелей 79 м² Мазутная Котельная	100 775 425	Могилевская область, Горецкий район, г. Горки, ул. Мира, 20А	10 077 540

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 26 34 24, 28 41 00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: 05.02.2010 г. в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Информация о земельном участке: площадь земельного участка – 1,3016 га, кадастровый номер – 722050200001006510.
5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.
6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 04.02.2010 г.; время: 17.00.
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
9. Извещение о проведении первого открытого аукциона с понижением начальной цены на 50 % по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликовано 10.11.2009 г. в газете «Звязда» № 212.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3» – продавец (организатор аукциона) 05 февраля 2010 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества с понижением начальной цены продажи на 50 %.

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Забор железобетонный 106 м² Забор железобетонный 88 м² Забор железобетонный 326 м² Забор железобетонный 334 м² Забор железобетонный 239,56 м² Водопроводная сеть Тепловая сеть Канализационная сеть (ливневая) Канализационная сеть (фекальная) Трансформаторная подстанция Кран-балка Административно-бытовой корпус Здание автозаправочной станции Арочник Здание мастерской Асфальтовое покрытие 1123,8 м² Асфальтовое покрытие 3183,5 м² Асфальтовое покрытие 1124,1 м² Асфальтовое покрытие 2719,2 м² Асфальтовое покрытие 258 м² Гараж Емкость 10 м³ Емкость 10 м³ Емкость 15 м³ Емкость 15 м³ Емкость 15 м³ Емкость 25 м³	756 768 758	Могилевская область, Чаусский район, г. Чаусы, ул. Первомайская, 48	75 676 880

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 26 34 24, 28 41 00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: 05.02.2010 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Информация о земельном участке: площадь земельного участка – 2,3312 га, кадастровый номер – 725450100001000000.
5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.
6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 04.02.2010 г.; время: 17.00.
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
9. Извещение о проведении второго открытого аукциона с понижением начальной цены на 50 % по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликовано 10.11.2009 г. в газете «Звязда» № 212.

Як нас дураць

НІ АЎТО, НІ ГРОШАЙ

Мінчанін узяў на рэалізацыю дарагую машыну, якую прадаў, аднак грошай гаспадару так і не вярнуў.

«Прадпрымальнага» мінчука, дарэчы, праваахоўнікі затрымалі і, паводле звестак прэс-афіцэра Савецкага РУУС Вольгі Яскевіч, у дачыненні да яго заведзена крымінальная справа па ч.4 артыкула 209 КК — «махлярства, учыненае арганізаванай групай альбо ў асабліва буйным памеры». І, сапраўды, толькі на адным сваім кліенце прайдзісвет змог добра «нагрэць» рукі. Летась ён узяўся прадаць аўтамабіль Volvo XC 90, рынкавы кошт якога на той момант складаў 20 тысяч долараў ЗША. І машыну паспяхова рэалізаваў, аднак грошай ад яго аўтааматар так і не дачакаўся.

Прычым, як мяркуецца, гэта не адзіны эпізод з «прадпрымальніцкай» дзейнасці падазронага. У праваахоўнікаў ёсць аператыўная інфармацыя, што згаданая асоба магла ўчыняць і іншыя махлярствы з аўтамабілямі. У прыватнасці, паводле меркавання супрацоўнікаў міліцыі, на працягу некалькіх гадоў затрыманы неаднаразова браў у людзей грошы, прапануючы прыгнаць аўто з-за мяжы, але потым пад рознымі прычынамі ні грошай не вяртаў, ні абяцаных машын не прадстаўляў. Цяпер следчыя выяўляюць падобныя факты з «працоўнай біяграфіі» падазронага.

Ігар ГРЫШЫН.

ГАЛАНДСКІ АЎКЦЫЁН, ПРОДАЖ ЗА АДНУ БАЗАВУЮ — УСЁ ДЛЯ ПОШУКУ ЭФЕКТЫЎНАГА ГАСПАДАРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Летась такім чынам было прададзена 111 будынкаў і 38 збудаванняў. У ходзе аўкцыённых таргоў кошт аб'ектаў значна вырастаў — часам у дзесяць-адзінаццаць разоў. Так было з комплексам вытворчых пабудоў па вуліцы Працоўнай у Ляхавічах і незавершаным будаўніцтвам дзіцячага санаторыя ў раёне вёскі Пескі Кобрынскага раёна. Пакупнікам, праўда, давялося заплаціць за права арэнды ўчастка зямлі. Але ў сельскай мясцовасці плата зусім невялікая, складае літаральна некалькі соцень тысяч рублёў.

20.30, 2.30 Трагіфарс «Вынас цела».
22.30, 4.30 Драма «Памяць не страшна».

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Асабістае жыццё доктара Селіванавай».
3.45 Крымінальная меладрама «Аса».
6.10 Меладрама «Наш агульны сябар».
8.10 Мюзікл па-руску «Падарожжа пана Перышона».
9.25 Фестывальнае кіно. «Дзікі сабака Дзінга».
11.45 Маст. фільм «Два капітаны». 1-я серыя.
12.55 Меладрама «Не баліць галава ў дзятла».
14.10 Дэтэктыў «Гаспадар тайгі».
15.35 Камедыя «Небяспечна для жыцця».
17.05 Новы хіт. «Чацвёртая група».
19.45 Прэм'ера. «Свой — чужы».
21.15 Лірычная камедыя «Міміно».
22.50 Фантастыка «Дзіўная гісторыя доктара Джэкіла і містэра Хайда».
0.20 Кінараман «Зорка чароўнага шчасця».

9.00, 17.00, 1.00 Меладрама «Віла на возеры».
10.35, 18.35, 2.35 Камедыя «Так робяць усе».
12.20, 20.20, 4.20 Драма «Пакой чараўніц».
13.45, 21.45, 5.45 Меладрама «Абложаныя».
15.25, 23.25, 7.25 Драма «Іржавы алюміній».

3.00, 21.00 Камедыя «Прыгожая эпоха».
5.00 Камедыя «Даверся мужчыну».
7.00 Камедыя «Караліна».
9.00 Драма «Сайман Магус».
11.00 Камедыя «Мой тата псіх».
13.00 Трагікамедыя «19».
15.00 Камедыя «Гісторыя пеўніка і бычка».
17.00 Драма «Калі я быў спеваком».
19.00 Драма «Заганныя сувязі».
23.00 Камедыя «Смешна, хаха».
1.00 Драма «Справы ў Нью-Джэрсі».

5.00 Серыял «Дзень нараджэння Буржуя».
6.00 М/ф.
6.25 М/ф «Чарапашкі ніндзя».
6.50 М/ф «Кураж — баязлівы сабака».
7.15 М/ф «Прыгоды мульцяшак».
7.40 М/ф «Гарэзлівыя анімашкі».
8.00, 16.00 Серыял «Дзіўныя падарожжы Геракла».
9.00, 22.45 Серыял «Зорныя вароты: Атлантыда».
10.00 Маст. фільм «Ледзяныя павукі».
12.00 Дак. фільм «Гарадскія легенды. Чарга за цудам».
13.00 Серыял «Медыум».
14.00 Серыял «Паляўнічыя за чужымі».
15.00, 23.45 «На краі Сусвету». Серыял.
17.00, 0.45 Серыял «Таямнічыя шляхі».
18.00 Серыял «Мерлін».
20.00 Серыял «Вострыў Харпера».
21.45 Серыял «Новы Амстэрдам».
1.45 Маст. фільм «Прывід у доме сям'і Бел».
4.30 Relaks.

7.00, 18.40, 5.20 «Рэванш-II».
7.55, 2.40 «Жанчына Ларэнса».
8.50, 14.10, 0.55 «Жонка Іуды».
9.45, 15.05, 3.35 «У пошуках бацькі».
10.40, 20.30 «Плата не па заслугах».
11.30, 16.55, 17.45, 21.20 «Стол на траіх».
12.25, 1.50, 6.10 «Тайна Лауры».
13.20, 23.05, 4.30 «Сямейныя вузы».
16.00, 19.35, 22.10 «Ніколі не позна?».
0.00 «Казачны прынц».

7.30, 13.20, 0.50 Геракл: Легендарныя падарожжы.
9.10, 15.00 Квантавы скачок.
10.00, 12.30, 15.50 Прытворшчык.
10.50, 16.40 Доктар Хто.
11.40, 17.30 Зорны крэйсер «Галактыка».
18.20 Пункт прызначэння — праўда.
20.00 Маст. фільм «Вёска праклятых».
21.40 Прытулак.
23.20 Маст. фільм «Геракл і лабірынт Мінатаўра».
1.40 Кароткаметражныя фільмы.

5.00, 9.00, 13.00 Фільм-казка «Салавей».
6.25, 10.25, 14.25 М/с «Ну, пачакай!». М/ф: «Навічок», «Кот, які ўмеў спяваць».
7.00, 11.00 М/ф «Васіліса Прыгожая». М/ф: «Розныя колы», «Сцёпа-марак».
8.00, 12.00 М/с «Супергероі».
23.00 Камедыя «Смешна, хаха».
1.00 Драма «Справы ў Нью-Джэрсі».
15.00 Маст. фільм «Прыгоды Электроніка».
16.15 М/с «Ну, пачакай!». М/ф: «Сын каменя», «Сын каменя і волат», «Прамое пападан-не».
17.00 М/ф «Апошняя нявеста Змея Гарыныча». М/ф: «Куплю прывід», «Чатыры манеты», «Леў і бык».
18.00 М/с «Супергероі». М/ф «Прыгоды Мурзілкі».

5.00, 7.10, 17.25, 21.35 Набалелае пытанне.
5.40, 18.05 Кабінет прыгажосці.
6.10, 18.35 Сакрэты здароўя.
6.35 Пачуцці чалавека 1.
7.50, 22.15 Выкрыццё прадуктаў.
8.20, 19.35, 22.45 Правілы здароўя.
8.45 Дзіця нарадзілася.
9.15, 23.40 Цела чалавека.
9.45, 0.10 Нетрадыцыйная медыцына.
10.15, 0.40 Школа розуму.
10.50, 15.25 Будзем здаровыя.
11.20, 1.10 Клінічны гіпноз.
11.50, 1.40 Панацэя.
12.20, 2.10 Я чакаю дзіця.
12.55, 15.55 Гісторыя хваробаў.
13.25, 2.40 Курс лячэння.
13.55, 3.10 Я перамог гэты боль.
14.25,16.25, 3.40, 4.36 Увага, ежа!
14.55, 4.05 Колькі вам гадоў?
16.50 Вялікая прабежка.
19.00, 21.05 Я расту.
20.00 Практыка здароўя.
20.35 Застацца ў жывых 1.
23.10 Выдаткі вытворчасці.

6.00, 10.50, 11.50, 12.50, 15.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.55 Парады ТДК.
6.35, 14.00 Усё лепшае, для Вас.
7.35, 10.00, 17.00, 1.00 Красуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00, 3.00 Гісторыі поспеху.
11.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
13.00, 22.00 Прыгажосць і здароўе.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупе».
15.00, 4.00 Твой дом.
15.50, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
19.00 Люстэрка жыцця.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
23.05 «Знакі лёсу».

7.00, 14.45 «Пятая перадача».
7.25, 15.15, 4.45 «Маланкавыя катастрофы».
8.20, 16.10, 23.00 Выжыць любой цаной.
9.15, 19.00, 22.00, 3.50 Разбуральнікі легендаў.
10.10 Вынайсці будучыню.
11.05, 20.00, 5.10 Цікава па ўсё.
11.35, 20.30, 5.40 «З чаго гэта зроблена?».
12.00, 17.05 Мегабудоўлі.
12.55, 18.00, 1.00 Круты цюнінг.
13.50 Амерыканскі чопер.
21.00, 2.55 «Галаваломы».
23.00 Скрыўленне часу.
0.00 Дзікія і небяспечныя.
2.00, 6.05 «У Лудольфаў на звалцы».

5.00 «Следства па справах драпежнікаў».
6.00 «Усё пра гадзюк».
7.00, 12.00 «Згублены рай Афрыкі».
8.00, 13.00 «Анатомія найбуйнейшых жывёл».
9.00, 15.00 «Дзікая прырода Расіі».
10.00, 17.00, 4.00 «Погляд знутры».
11.00, 19.00, 1.00 «Секунды да катастрофы».
11.30, 19.30, 1.30 «Рэальнасць або фантастыка».
14.00 «Фатографы дзікіх жывёл».
16.00 «Грандыёзныя пераезды».
18.00 «Некранутая прырода».
18.00, 20.00, 23.00, 2.00 «З пункту гледжання навукі».
21.00, 0.00, 3.00 «Забароны».

7.00, 12.00, 16.00, 19.00, 20.00, 23.00, 1.00, 4.00 Сусветны падарожнік.
8.00, 15.30 Пра галоўнае.
8.30 Рудзі Макса падарожнічае па свеце.
9.00, 9.30 Далёкія берагі.
10.00, 13.00, 18.00 Шэф-кухар за мяжой.
10.30 Смак Іспаніі.
11.00 Ежа і напоі з Варунам Шармай.
13.30, 18.30, 0.30, 6.00 Прагны вандроўнік.
14.00 Падарожжа са смакам.
14.30 Культура і кухня Лацінскай Амерыкі.
15.00 Круасаны ў джунглях.
17.00 Лыжны свет.
17.30 Флойд у Афрыцы.
21.00, 2.00 У пошуках невядомага.
22.00, 0.00, 3.00, 6.30 Разюшаная планета.
22.30, 3.30 ФотаДаследчыкі.
5.00 Па чыгунках Швейцарыі.

7.00, 11.50, 16.25 «SOS дзікай прыроды».
7.25, 12.15, 15.30 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
7.50 Тэрыторыя жывёл.
8.45, 12.45 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
9.40, 16.50, 6.10 Ратаванне жывёл у Аўстраліі.
10.05, 20.10, 23.50, 4.25 Паліцыя Фенікса — аддзел па абароне жывёл.
10.55 Прагулкі Джэфа Корвіна.
13.40 Паветраныя сківіцы.
14.35, 5.20 Вуліца лемураў.
15.00, 5.45 «Выхадкі малпаў».
15.55, 6.35 «Дэльфінавыя будні».
17.20, 22.55, 3.30 Паліцыя Маямі. Аддзел па абароне жывёл.
18.15, 22.00, 2.35 Пад покрывам ночы. Гіпапатам.
19.10, 0.45 Паветраныя сківіцы-2.
21.05, 1.40 Дзікія і небяспечныя.

9.30 Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў.
11.00, 14.00 Лёгкая атлетыка.
12.30, 18.30, 20.40 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
15.30 Шары.
19.30, 21.15 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
20.30 Футбол. Еўрагалы.
22.45 Цімберспорт. Чэмпіянат свету.
23.45 Самыя дужыя людзі планеты.
0.45 Экстрэмальны спорт.
1.30 Покер.

5.00, 12.25, 1.40 Music.
6.00 «Стэрэа_раніца».
8.50, 15.00 Бобыск і спатканне.
9.15, 15.25 Наступны.
9.40 Тайныя спакусы курорта-нага гатэля.
10.05 Зоркі на далоні.
10.35, 18.40 «Губка Боб квадратныя штонікі».
11.00, 19.05 «Аватар».
11.25 Руская дзясятка.
12.50, 23.05 Мадэльная школа ведзьмы Джэніс.
13.20 Уся праўда пра Charlize Theron.
14.10 Ужо можна.
14.35 Па дамах: залатыя дзеткі.
16.00 Тачку на пракачку.
16.25 Ікона відэагульняў.
16.55, 20.25 Серыял «Універсітэт».
17.45, 21.20 «Клініка».
19.30 Уся праўда пра Will Smith.
22.10, 0.50 «Паўднёвы парк».
22.35 Трэндзі.
23.30 «Сэкс» з Тэкілай.
0.20 Віртуальны мясатрас.

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10 Раніца з Інтэрам.
9.15 Кормячыя бацькі.
9.20 Куміры і куміркі.
10.00 Урокі цётачкі Савы.
10.15 Неспартыўнае жыццё.
10.45, 18.00, 4.20 Серыял «Суседзі».
11.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.10 Шыканём.
13.00, 0.45 Ключавы момант.
13.50 Не першы погляд.
14.05 Песня года.
15.15, 0.15 Знак якасці.
15.45, 1.30 Лекары.
16.30 Серыял «Мачаха».
18.30, 4.45 Судовыя справы.
19.15, 2.15 Серыял «Кармеліта».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
20.30, 3.30 Серыял «Асуджаная стаць зоркай».
21.30 Вялікая палітыка з Яўгенам Кісялёвым.
4.45 Украінская топ-дваццатка.
6.00 Дак. фільм «Дракула і іншыя».

6.00 «Служба вышуку дзяцей».
6.05 Серыял «Цыганскае сэрца».
6.55, 7.35, 8.05 «Сняданак з 1+1».
7.00, 8.00, 9.00, 17.00, 19.30, 23.25, 4.45 ТСН.
7.10 М/ф «Любімы прышэлец».
9.20 Серыял «Сем жонак аднаго халасцяка».
10.55, 5.45 Серыял «Ярмолавы».
12.00, 17.15 «Урачы».
13.00, 18.30 Серыял «Толькі каханне».
14.00 Серыял «Барвіха».
15.00 Серыял «Раён Мэлроўз».
16.00 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
19.25 «Надвор'е».
21.20 Баявік «Універсальны салдат».
23.30 Баявік «Уцёкі немагчымыя».
1.55, 4.15 Камедыя «Сем кабінак».
3.25 Серыял «Дзень нараджэння Буржуя-2».

23.45 ФІЛЬМ ДНЯ

«АНТЫКІЛЕР» (РАСІЯ, 2002 Г.)

Тры гады таму аператыўнік крымінальнага вышуку Кораней па мянушцы Ліс «па-свойму» разабраўся з чарговым мярзотнікам і трапіў у турму. Злачынны аўтарытэт Шаман, які яго засадзіў, зрабіў усё, каб былы опер ужо ніколі не выйшаў на волю. Але Ліс выжыў і вярнуўся ў родны горад, які захліснула хваля крымінальных войнаў.

Рэжысёр — Егор Канчалоўскі. **У ролях:** Юрый Куцэнка, Міхаіл Ульянаў, Любоў Талкаліна, Сяргей Шакураў, Аляксандр Балуеў, Яўген Сідзіхін, Віктар Сухарукаў, Сяргей Векслер, Аляксандр Бяляўскі, Іван Бортнік, Міхаіл Яфрэмаў.

СУБОТА, 6 ЛЮТАГА

6.50 Дак. серыял «Афрыка. Магічны кантынент».
7.20 Існасць.
7.45 Дзень спорту.
7.55 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.05 Здароўе.
9.35 Серыял «Сышчыкі рэённага маштабу-2». 1-я серыя.
10.25 Шпілька.
10.55 Ранішняя хваля.
11.30 «OFF STAGE LIFE».
11.45 Алімпійскі часопіс.
12.10 Камедыя «Кубанскія казакі».
14.10 «Тэатральны раман».
14.35 «Зона Х». Вынікі тыдня.
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 Вакол планеты.
16.10 Дак. цыкл «Зорнае жыццё». «У палоне ўласнага стылю».
17.10 «Зямля беларуская». «Шуміліна. Вяртанне да вытокаў».
17.25 «Лёгка сказаць». «Вольга Дашчынская».
17.55 «Ваша лато».
18.45 Латарэя «Пяцёрачка».
19.20 «КЕНО».
19.25 Канцэрт групы Сплін».
21.00 Панарама.
21.40 Меладрама «Закахацца ў нявесту брата».
23.30 Уласнай персонай.

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
9.45 «Здароўе».
10.30 «Смак».
11.10 «Адзіны пастыр». Да гадавіны інтранізацыі Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла.
11.40 «Мая радаслоўная. Яўгенія Сіманава і Юрый Вяземскі».
12.30 «Дзеля смеху».
13.15 Тэлечасопіс «Саюз».
13.45 «Кінаметры вайны». «Страціць і знайсці. Бацька».
14.15 «Бацька». Маст. фільм.
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 Юбілейны вечар Ігара Мацвіенкі.
18.55 «Адзін супраць усіх».
19.55 «Чакай мяне». Беларусь.
21.05 «Цудоўная пяцёрка».
22.20 «Пражэктарперысхілтан».
22.55 Фантастыка «Хронікі Рыдзіка».

7.40 Смачна з Барысам Бурдой.
8.15 Усё пра бяспеку.
8.40 Тэлепорт.
9.10 Жансавет.
9.50 Свая кампанія.
10.35 Лабірынты: маёнтак Талстых у Беларусі.
11.00 «Страсці па культуры».
11.45 Дэтэктыў «План «Б».
15.55 Дак. фільм «Дотык».
16.25 Маст. фільм «Эскадрон гусар лятучых».
19.25 «Зоркі гумару».
20.30 Камедыя «Сямейка Ады».
22.15 Жывы гук.
23.00 Казанова.
23.25 Трылер «Не кажы нікому».

6.40 «Анфас».
6.55 «Агенцтва 2». Серыял.
7.20 Фільм — дзецям «Госця з будучыні».
9.30 «Культурнае жыццё».
10.00 «Крокі да поспеху».
10.55 «Мінск і мінчане».
11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».
13.15 «Новыя падарожжы дылетанта».
13.45 «Фантастычныя гісторыі».
14.40 Маст. фільм «Патрэбныя людзі».
16.20 «Наша справа».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.40 «Відзьма-нявідзьма».
17.20 «Пяць гісторый».
17.50 Маст. фільм «Гарадскі пейзаж».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Зорны рынг». Група «Litesound» супраць групы «Новы Арыель».
21.30 Маст. фільм «Бобі».
23.35 Маст. фільм «Забойствы крумкачоў».
1.15 «Сакрэтныя матэрыялы» Серыял.

4.55 «Білет на сёння».
5.05, 13.00 Серыял «Закон Мерфі».
6.00, 11.10 Фільм-казка «Залатая гусь».
7.20 М/ф «У трыдзявятым веку».
7.35 Мультсерыял «Паляўнічыя на драконаў».
8.30 «У гасцях у Мінуткі».
8.45 «Мільён пытанняў аб прыродзе».
9.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці.
9.10 «Смачны свет. Кухня Комі».
9.40 Серыял «Біндзі: дзяўчынка з джунгляў».
10.10 «Мар, дзейнічай, будзь!».
10.40 «Даведнік».
12.45 М/ф «У трыдзявятым веку».
14.00, 0.15 «Дак. дэтэктыў. Аперацыя «Тапаз». Шалёныя грошы».
15.10 «Саюзнікі».
15.40, 1.35 Маст. фільм «Абдуладжан, або Прысвячаецца Сцівену Спілбергу».
17.45 «Рэспубліка сёння».
18.20 Маст. фільм «Кактус».
20.00 «Увесь Чэхаў».
21.00, 1.15 «Навіны Садружнасці. Культура».
21.40, 4.00 «Асабістыя рэчы з Андрэем Максімавым».
22.40 Серыял «Усё золата свету».
23.45 «Пра што не прынята гаварыць».

9.00 «К-гульні».
9.10, 23.35 «Надвор'е».
9.15 «Адзінка ў кубе».
9.45 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
10.00 Трылер «Маўчанне ягнят».
12.15 «Кіно—кліп—парад».
12.30 Вестэрн «Банда старых».
14.00 «Мультпарад» па выхадных.
15.45 «Навіны кіно».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Серыял «Альф».
17.00 Дак. фільм «Старыя інструменты Беларусі».
18.00 Серыял «Мора душ».
19.00 Серыял «Прафесіяналы следства»
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-гульні» — «Лайт».
21.10 Драма «Доні Браска».

6.00, 23.30 «PLAY».
11.00, 18.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
13.00 Серыял «Ранеткі».
21.00 Серыял «Татавы дочкі».

07.00, 11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
7.10 Маст. фільм «Будзьце маёй цешчай».
8.35 «Крывое люстэрка».
10.25 «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.10 «Суботнік».
11.50 «Хто ў доме гаспадар».
12.20 Маст. фільм «Манялог».
14.15 «Пакой смеху».
15.10 «Покер-45. Сталін, Чэрчыль, Рузвельт».
17.00 «Суботні вечар».
19.45 «Гарадок». Дайджэст.
20.20 Маст. фільм «Пажар».

5.50 Маст. фільм «Муха».
7.35 «Казкі Бажэнава».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.25 «Авіятары».
8.55 «Агляд».
9.25 «Без рэцэпта».
10.25 «Галоўная дарога».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.25 «Жаночы погляд». Фэцісавы.
14.10 Драма «Прапажа алмаза «Сляза».
16.25 Серыял «Адвакат».
17.15 «Вочная стаўка».
18.10, 19.25 «Прафесія — рэпарцёр».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
20.00 «Праграма Максімум».
21.05 «Рускія сенсацыі».
22.00 «Ты не паверыш!».
22.50 Камедыя «Сустрэча з бацькам».
0.25 Фільм жахаў «Пір».

5.00 «Котасабака». Мультсерыял.
5.30 «Гэй, Арнольд!» Мультсерыял.
6.00 «Прыгоды Джымі Нейтрона, хлопчыка-генія». Мультсерыял.
7.25 Серыял «Саша + Маша».
8.00 «Невытлумачальна, але факт». Дак. расследаванне.
9.00 «Школа рамонту».
10.00 «Школа гоблінаў». Дак. фільм.
11.00 «Comedy Woman».
12.00 Клуб былых жонак.
13.00 «Cosmopolitan».
14.00 Серыял «Шчаслівыя разам».
16.00 Баявік «Пастка».
18.30 Серыял «Жаночая ліга: хлопцы, грошы і каханне».
19.00 Баявік «Забіць Біла».
21.15 «Наша Russia».
22.00, 0.40 «Дом-2».
23.00 «Забойная ліга».
0.10 «Атака клоўнаў».
1.10 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
1.45 Баявік «Даміно».
4.10 «Начныя гульні».

5.30 «Еўраньюс».
9.45, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
9.10 Біблейскі сюжэт.
9.40 «Тайна залатой гары». Маст. фільм.
10.55 Хто ў доме гаспадар.
11.25 «Чыпаліна». Маст. фільм.
12.50 «Баранкін, будзь чалавекам! М/ф.
13.10 «Нататкі натураліста».
13.40 Магія кіно.
14.20 «Сусветныя скарбы культуры». Дак. фільм.
14.35 Марыс Янсанс і сімфанічны аркестр Баварскага радыё.
15.45, 0.55 «Вялікі венецыянскі карнавал». Дак. фільм.
16.40 «Ідыёт». Маст. фільм.
18.35 «У вашым доме». Ігнат Салжаніцын.
19.20 «Нерон». Маст. фільм. 1-я серыя.
21.00 Навіны культуры.
21.25 «Чорны манах». Спектакль Маскоўскага тэатра юнага гледача.
23.10 «Вялікія надзеі». Дак. фільм.
0.05 Трыа Паці Осцін у Базелі.

6.00, 10.00, 15.00, 20.00, 1.00 «Мінулы час».
**6

НЯДЗЕЛЯ, 7 ЛЮТАГА

7.30 Камедыя «Пераможцы ў шоу».
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.05 «Арсенал».
9.35 Дак. фільм «Зброя».
9.50 Альманах падарожжаў.
10.20 Культурныя людзі.
10.55 У свеце матораў.
11.30 Nota Bene.
12.10 Кінааповесць «Джыквём да панядзелка».
14.05 Дак. цыкл «Гарачыя кропкі».
14.35 Фэнтэзі «Гары Потэр і філасофскі камень».
15.10 Навіны рэгіёна.
17.40 Алімпійскі часопіс.
18.00 Суперлато.
19.15 «OFF STAGE LIFE».
19.30 Дак. цыкл «Мая праўда». «У галоўнай ролі Сяргей Іваноў».
20.30 «Спартлато 5 з 36».
20.50 «КЕНО».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.05 Камедыя «Прыгажунчык».

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь.
9.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
9.55 «Бесталковыя нататкі».
10.15 Пакуль усе дома.
11.05 Фазэнда.
11.40 «Ранішняя пошта».
12.15 «Разумніцы і разумнікі».
13.00 «Песні Перамогі». «Людзі кантрастаў».
13.35 Маст. фільм «Двое і адна».
15.00 «Белка, Стрэлка і іншыя...».
16.15 Навіны спорту.
16.20 Тэорыя неверагоднасці. «Блакітная кроў».
16.50 Драма «Мацярынскі інстынкт».
18.40 «Ірына Радніна. 6.0». Юбілейны вечар.
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.40 KiBiH-2010 у Сочы.
0.05 Камедыя «Маё першае вяселле».

7.15 Звон.
7.40 Мір вашаму дому.
7.50 Смачна з Барысам Бурдой.
8.20 Камедыя «Сямейка Ады».
10.00 Школа рамонту.
11.00 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
11.45 Кінапробы.
12.05 Бухта капітанаў.
12.40 «Правы чалавека».
13.00 Футбол. Еўра-2012. Жараб'ёўка адборачнага турніру.
13.50 Дэтэктыў «План «Б».
16.30 Жаночая ліга.
16.55 Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) — Віцязь (Чэхаў).
19.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Чэлсі — Арсенал.
21.15 Тэлебарометр.
21.35 Экспедыцыя.
22.05 Камедыя «Вялікі Стэн».
0.00 Свая музыка. Працяг.
0.30 ПРАсоўванне+.

6.55 Серыял «Агенцтва 2».
7.45 Камедыя «Даспехі бога 2: аперацыя кондар».
9.30, 19.00 Аўтапанарама.
10.00 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.55 «Вялікае сненданне».
11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».
13.15 «Добры дзень, доктар!».
13.50 Маст. фільм «Каралі і капуста».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Рэпарцёрскія гісторыі».
17.20 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «5 невядомых».
22.20 Маст. фільм «Прэч з неба».
0.05 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

4.55 «Білет на сёння».
5.05, 13.00 Серыял «Закон Мерфі».
6.00 «Любімыя акцёры».
6.10, 11.20 Камедыя «Асабістае жыццё каралевы».
8.00 Мультсерыял «Паляўнічыя на драконаў».
8.30 «АБВГДэйка».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці.
9.10 «Свет анімацыі — анімацыя свету».
9.40 Серыял «Біндзі: дзяўчынка з джунгляў».
10.10 «Ведаем рускую».
11.10 «Любімыя акцёры».
12.40 М/ф «Васіліса Мікулішна».
14.00, 0.15 «Дак. дэтэктыў. Бумеранг, які паражае. Перахват на зямлі. Справа пра суперракету.
15.10 «Дыяспара».
15.40 Серыял «Багатая і каханая».
19.00, 1.45 Серыял «Абаронца».
20.00 «Разам».
21.00, 1.15 «Паўночнікі».
21.40, 4.00 Канцэрт «Гэты малінавы звон».
22.40, 3.00 Серыял «Усё золата свету».
23.45 «Даведнік».

9.00, 23.25 «Надвор'е».
9.15 «Мой любімы гадаванец».
9.45 Мультпарад.
10.15 «Адшукваецца адпачынак».
10.45 Баявік «Доні Браска».
13.05 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».
14.00 Канцэрт «Па вашых просьбах».
14.40 «К-відэа» для дзяцей.
15.05 Фільм для дзяцей.
16.30 Серыял «Альф».
17.00 Серыял «Мора душ».
19.00 Серыял «Прафесіяналы следства».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.10 Камедыя «Гулякі».
23.10 «Навіны кіно».

6.00, 23.30 «PLAY».
11.00, 20.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
13.00 Серыял «Кадэцтва».
18.00 Серыял «Татавы дочкі».

7.00, 11.10 Маст. фільм «Пажар».
11.00, 14.00 Весткі.
12.10 Маст. фільм «Вялікае каханне».
14.15 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
14.45 «Вялікая выстава пяцьдзясят дзявятага». Дак. фільм.
15.30 Маст. фільм «Вершнік без галавы».
17.15 «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
19.00 Весткі тыдня.
20.05 «Сумленны дэтэктыў».
20.40 «Танцы з Зоркамі». Сезон-2010.
23.20 «Спецыяльны карэспандэнт».
0.20 Маст. фільм «Сумная дама чырвоў».

6.10 Камедыя «Сустрэча з бацькам».
7.40 Мультфільм.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Дзікі свет».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома!».
10.20 «Выратавальнікі».
10.45 «Асабліва небяспечны!».
11.25 «Першая кроў».
11.50 «Дачны адказ».
13.20 «Крамлёўская кухня». Прыслуга.
14.10 Камедыя «Прышэльцы».
16.25 Серыял «Адвакат».
17.15 «І зноў прывітанне!».
18.10 «Прафесія — рэпарцёр».
18.30 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
19.00 Сёння. Падагульняючая праграма.
19.55 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.25 Серыял «Следапыт».
0.00 «Авіятары».

5.00 «Гэй, Арнольд». Мультсерыял.
6.00 «Прыгоды Джымі Нейтрона, хлопчыка-генія». Мультсерыял.
7.25, 4.45 Серыял «Саша + Маша».
8.00 «Невытлумачальна, але факт». Дак. расследаванне.
8.55 «Першая Нацыянальная латарэя».
9.00 Школа рамонту.
10.00 «Не ўсе згодныя на каханне». Дак. фільм.
11.00 «Інтуіцыя».
12.00 Баявік «Пастка».
14.30 «Універ». Сітком.
16.00 Баявік «Забіць Біла».
18.30 Серыял «Жаночая ліга: хлопцы, грошы і каханне».
19.00 Баявік «Забіць Біла-2».
22.00, 1.35 «Дом-2».
23.00 «Comedy Woman».
0.00 «Смех без правілаў».
1.05 «Атака клоўнаў».
2.05 Меладрама «Рэальнае каханне».

5.30 «Еўраньюс».
9.45, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
9.10 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
9.40 «Ва ўладзе золата». Маст. фільм.
11.15 «Легенды сусветнага кіно». Ражэ Вадзім.
11.45 «Набытак рэспублікі».
12.00 «Брэменскія музыканты». «Па слядах брэменскіх музыкантаў». «Вясёлая карусель». М/ф.
12.45, 0.55 «Жыццё з ваўкамі». Дак. фільм. 1-я серыя.
13.35 «Што рабіць?».
14.20 «У нас таленту шмат...».
15.00 «Дзеці Ванюшына». Маст. фільм.
16.35 «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Ж. Масснэ. Опера «Манон».
19.20 «Нерон». Маст. фільм.
20.55 Вялікія раманы XX стагоддзя. Ава Гарднер і Ховард Х'юз.
21.25 «Свінцовыя часы». Маст. фільм.
23.25 «Джэм-5». Вес Мантгомеры.
0.25 «Лебедзі Няпрадвы». М/ф для дарослых.
1.45 «Жан-Поль Марат». Дак. фільм.

6.00, 10.00, 15.00, 1.00 «Мінулы ЧАС».
6.50, 9.45, 14.45 «Ералаш».
7.15, 3.15 «Будзільнік» з С. Марціносонам.
8.00, 4.00 «Матадор». 1992 год.
9.10 «Ранішняя пошта».
11.00, 2.00 «Народжаныя ў СССР».
12.15 «Да і пасля...». Год 1973.
13.40 Камедыя «Эфект Рамашкіна».
15.45 Тэатральны капуснік. 1988 год.
17.15 «Песня заўсёды з намі». 1975 год.
18.00 «Дажывём да панядзелка». Маст. фільм.
19.45, 0.45 «Добрай ночы, малыя!».
20.00 «Быў ЧАС».
21.00 «Хіт-парад «Астанкіна». 1993 год.
22.15 «Рытмічная гімнастыка». 1984 год.
23.00 «Чао!». Тэлеспектакль.
5.10 «Ранішняя пошта».

6.30, 12.30 Меладрама «З той пары, як мы разам».
8.00 Плюс кіно.
8.30, 14.30 Маст. фільм «Вольны вецер».
10.40, 16.40 Драма «Вандроўны аўтобус».
18.30, 0.30 Дэтэктыў «Чужыя тут не ходзяць».
20.30, 2.30 Маст. фільм «Апладысменты, аплодысменты...».
22.30, 4.30 Камедыя «Асцярожна, бабуля!».

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Прыватнае жыццё доктара Селіванавай».
3.45 Новы хіт. «Мацярынскі інстынкт».
5.20 Лірычная камедыя «Здарэнне, якога ніхто не заўважыў».
6.25 Дэтэктыў «У палаце прыбою».
7.50 Музычны фільм «Казка падарожжаў».
9.35 Трагікамедыя «Насця».
11.45 Экранізацыя школьнай праграмы. «Барыс Гадуноў».
14.10 Меладрама «Дрэнны добры чалавек».
15.50 Трагікамедыя «Асенні марафон».
17.20 Новы хіт. «Дунечка».
19.45 Новы хіт. «Старыя».
21.30 Мюзікл па-руску. «Сватанне гусара».
22.40 Псіхалагічная драма «Асабістая справа суддзі Іваноў».
0.00 Баявік «Уцёкі ад смерці».
1.25 Меладрама «Блізкая далечыня».

9.00, 17.00, 1.00 Меладрама «Бясконцы гарызонт-2».
10.35, 18.35, 2.35 Меладрама «Прыгожыя дзяўчаты».
12.30, 20.30, 4.30 Камедыя «Узыходзячая зорка».
14.15, 22.15, 6.15 Драма «З полымя і святла».
15.05, 23.05, 7.05 Драма «Зімняя казка».

3.00 Драма «Адчужэнне».
5.00 Камедыя «Скотланд. Пенсільванія».
7.00 Драма «Смерць пана Лазарэску».
9.30 Трагікамедыя «Візіт аркестра».
11.00 Камедыя «Паглядзі на мяне».
13.00 М/ф «Астэрыкс і вікінгі».
15.00 Драма «Харысты».
17.00 Драма «Тайнае жыццё слоў».
19.00 Камедыя «Хлопец з пузыра».
21.00 Камедыя «Сакратарка».
23.00 Трагікамедыя «Апошняе жыццё ў Сусвеце».
1.00 Трылер «Паўсвятло».

5.00 М/ф.
6.00 М/ф «Касмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
6.20 М/ф «Кураж — баязлівы сабака».
6.50 М/ф«Чарапашкі ніндзя».
7.40 М/ф «Чалавек-павук».
8.30 Маст. фільм «Мар'я-майстрыха».
10.15 Маст. фільм «Чалавек у жалезнай масцы».
13.30 Серыял «Перагаворшчыкі».
15.00 Дак. фільм «Тайны вялікіх магаў».
16.00 Маст. фільм «Да скарбаў авіякатастрофы».
18.00 Дак. фільм «Гарадскія легенды. Новарасійск. Могілкі караблёў».
19.00 Маст. фільм «Пастка».
21.15 Маст. фільм «У чужым радзе».
23.15 Маст. фільм «Выкрадзеныя».
1.15 Маст. фільм «Смага».
3.15 Маст. фільм «Укушаны».

7.00, 19.35, 1.50 «Ідэальная пара».
7.55 «Стол на траіх».
12.20 «Гатуем разам з Анхелем Ласана».
13.20 «Рэванш-II».
17.50 «Казачны прынц».
18.40 «Марыя Роса».
20.30 «Мужчынскія гісторыі, адрасаваныя жанчынам».
21.30 «Такое жыццё».
22.25 «Каханы па наёме».
0.00 «Дона Флор і два яе мужы».
0.55 «Прысутнасць Аніты».
2.40 «Плата не па заслугах».

7.30, 23.10 Геракл: Легендарныя падарожжы.
11.30 Прытворшчык.
15.25 Маст. фільм «Даліна Твістар».
17.45 Прыстанак.
18.35 Маст. фільм «Смяротны вірус».
20.00 Маст. фільм «Цёмныя нябёсы».
21.30 Склад № 13.
1.40 Кароткаметражныя фільмы.

5.00, 9.00 Фільм-казка «Юнацтва Бэмбі».
6.05, 10.05, 14.05 М/с Ну, пачакай!». М/ф: «Трое на востраве», «Дарожная казка», «Шчаслівы Рыгор».
7.00, 11.00 М/ф «Ляўша». М/ф: «Церамок», «Ваўчок».
8.00, 12.00 М/ф «Тры таўстуны». М/ф: «Жыў-быў сабака», «Маша і чароўнае варэнне».
13.00, 15.00 Маст. фільм «Прыгоды Электроніка».
16.05 М/с «Ну, пачакай!». М/ф: «Два сквапныя медзведзяняці», «Следапыт», «Чаму сышло кацяня?».
17.00 М/ф «Ключ».
18.00 М/ф: «Казка пра Залатога пеўніка», «Алё! Вас чую!».

5.00 Не выходзячы з дому.
5.35, 18.35, 19.35 Увага, ежа!
6.00, 3.15 Выдаткі вытворчасці.
6.35, 21.05 Вялікая прабежка.
7.05, 1.10 Я расту.
7.40, 12.30, 22.40, 2.50 Правілы здароўя.
8.05, 22.10 Практыка здароўя.
8.40 Застацца ў жывых 1.
9.10, 11.20, 23.35, 1.40 Набалелае пытанне.
9.50, 0.15 Кабінет прыгажосці.
10.20, 0.45 Сакрэты здароўя.
10.45 Пачуцці чалавека 1.
12.00, 2.20 Выкрыццё прадуктаў.
12.55, 21.35 Дзіця нарадзілася.
13.25, 3.45 Цела чалавека.
13.55, 4.15 Нетрадыцыйная медыцына.
14.25 Школа розуму.
15.00, 17.35 Будзем здаровыя.
15.30 Клінічны гіпноз.
16.00 Панацэя.
16.30 Я чакаю дзіця.
17.05, 18.05 Гісторыя хваробаў.
19.00 Курс лячэння.
20.00 Я перамог гэты боль.
20.35 Колькі вам гадоў?
23.05 Хуткая дапамога.
4.45 Энцыклапедыя памылак.

6.00, 11.50, 12.50, 15.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.55 Парады ТДК.
6.35, 14.00 Усё лепшае, для Вас.
7.35, 10.00, 17.00, 1.00 Красуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00 Ранішні фрэш.
11.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
13.00, 22.00 Прыгажосць і здароўе.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупе».
15.00 Маю права.
15.50, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
19.00 Люстэрка жыцця.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
23.05 «Знакі лёсу».
3.00 Гісторыі поспеху.
4.00 Твой дом.

7.00, 4.45 Цікава пра ўсё.
7.25 З чаго гэта зроблена?
7.55, 15.15, 3.50 «Галаваломы».
8.50, 14.20, 21.00, 2.55 Разбуральнікі легендаў.
9.45 «Відавочца».
10.40 Аляска. Вялікія гонкі.
11.35 Выжыць любой цаной.
13.25 Рачныя монстры.
16.10, 2.00 Скрыўленне часу.
17.05 Махінатары на трасе.
18.00 Вялікія і хуткія.
19.00 Амерыканскі чопер.
20.00 Круты цюнінг.
22.00 Рос Кемп.
0.00 Жанчыны-забойцы.
1.00 «Рай, які ператварыўся ў пекла».
5.10 Мегабудоўлі.
6.05 Гіганцкія будоўлі.

5.00, 12.00 «Самы цяжкі ў свеце рамонт».
6.00 «Усё пра акул».
7.00 «Свет Серэнгеці».
9.00 «У аб'ектыве».
11.00 «Цуды інжынерыі».
13.00 «Паляванне на паляўнічага».
14.00 «Даліна грызлі».
15.00 «Хрустальныя чэрапы».
16.00 «Сакрэты Біблі».
17.00 «2012: апошняе прадказанне».
18.00 «Ліхтугі за мяжой».
19.00, 4.00 «Расследаванні авіякатастроф».
20.00, 23.00, 2.00 «Самыя запамінальныя фота «National Geographic».
21.00, 0.00, 3.00 «Буйным планам: для «National Geographic».
22.00, 1.00 «З пункту гледжання навукі».

8.00 Па чыгункі Швейцарыі.
9.00 Шляхі зносінаў.
10.00, 10.30, 11.00, 11.30 Паход па Афрыцы.
12.00, 16.00, 21.00, 23.00, 1.00, 5.00, 6.00 Сусветны падарожнік.
13.00 Планета ежы.
14.00 Шэф-кухар за мяжой.
14.30 Святочная Індыя.
15.00 Флойд адкрывае.
15.30 Падарожнічайце сёння.
17.00, 17.30 Смак Іспаніі.
18.00, 2.00 У пошуках згубленага снегу.
18.30, 2.30 Лыжны свет.
19.00, 22.30, 3.00 Раз'юшаная планета.
19.30, 3.30 ФотаДаследчыкі.
20.00, 4.00 У пошуках невядомага.
22.00 Круасаны ў джунглях.
0.00 Сусветная адысея Джуліана і Камілы.

7.00 Вуліца лемураў.
7.25, 12.15 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
7.50 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.45 Тэрыторыя жывёл.
9.40, 6.10 Выатаванне жывёл у Аўстраліі.
10.05, 22.55, 3.30 Паліцыя Маямі. Аддзел па ахове жывёл.
10.55, 5.20 «Аддзел абароны жывёл — Паўднёвая Афрыка».
11.50, 6.35 «Ветэрынары на маршы».
12.45 «Жывёлы, падобныя на нас».
13.40, 20.10, 23.50 Планета Зямля.
14.35 Аддзел па абароне жывёл.
15.30 «Дзённік вялікай кошкі».
16.25 «Якія жывуць з ваўкамі».
17.20 Жыццё ў зграі.
18.15 «Небяспечныя маршруты Макса».
19.10 Рай для шымпанзэ.
21.05, 1.40, 2.35 Дзікія і небяспечныя.
0.45 Кітовыя войны.
4.25 Пад покрывам ночы.

9.30, 17.25 Снежны выхадны.
9.35 Санны спорт. Кубак свету.
10.00, 14.30, 15.30, 20.00, 0.00 Скачкі на лыжах з трамплінаў. Кубак свету.
11.30 Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў.
13.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы-2012. Жараб'ёўка.
13.45 Веласпорт.
18.30 Фігурнае катанне.
21.15 Бокс.
23.00 Шары.
1.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету.

5.00, 0.30 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
9.15, 19.30 «Аватар».
10.05 Інтуіцыя супраць спакусы.
10.30 Трэндзі.
11.00 Гарачыя хлопцы ля плыты.
11.30 Ікона відэагульняў.
12.00, 20.20 Тачку на пракачку.
12.25 Вобыск і спатканне.
13.15 «Кароль вечарынак-2». Маст. фільм.
14.50 Мой клон. Hennifer Lopez.
15.15 Доктар Галівуд.
16.10 «Праўда жыцця».
17.00 «Жыві свабодна або памры». Маст. фільм.
18.35, 23.15 «Губка Боб квадратныя штонікі».
21.10 Падстава.
21.35 Зорны бой насмерць.
22.25 «Паўднёвы парк».
0.05 Кругасветка ў пошуках непрыемнасцяў.

7.00 «Квадратны метр».
7.45 Украінская топ-дваццатка.
9.00, 16.00, 18.00 Навіны.
9.10 Вяселле для цябе.
9.40 Не першы погляд.
10.00 Украіна, уставай!
10.30 Тыдзень моды.
11.00 М/ф «Каралеўскія зайцы».
11.15 Самы разумны.
13.00 Канцэрт «Залатая шарманка».
16.15 Дак. фільм «Маладыя горы».
17.05, 5.55 Формула кахання.
18.15, 3.50 Канцэрт «CD-band і сябры».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці тыдня».
21.00 Ноч выбараў.
5.25 Парк аўтамабільнага перыяду.
6.40 Закладнікі легендаў.

6.25 «Лятучы дом».
7.15 М/ф «Паляўнічыя на драконаў».
9.05 Латарэя «Лато-забава».
10.10 «Качыныя гісторыі».
11.00 «Караоке на майдане».
11.55 «Смакуем».
12.35 «Шэсць кадраў».
13.25, 4.15 Камедыя «100 вяселляў, або Толькі навічкі жэняцца».
15.20 Камедыя «Нявеста з таго свету».
17.20 Камедыя «Бяглячкі».
19.30 ТСН.
21.15 Маст. фільм.
23.15 «Свецкае жыццё».
0.20 Трылер «Ціскі».
2.45 Маст. фільм.
5.45 Маст. фільм.

22.05 ФІЛЬМ ДНЯ

«ПРЫГАЖУНЧЫК» (ГЕРМАНІЯ, 2007 Г.)

Скандальны плэйбой-журналіст Людо, які атрымаў восем месяцаў турмы за тое, што спрабаваў трапіць на закрытае вяселле Уладзіміра Клічко, вызвалены на выпрабавальны тэрмін пры ўмове, што ён пройдзе курс працатэрапіі ў дзіцячым садку. Як даглядаць дзяцей, Людо не вельмі ўяўляе, але ў садку працуе яго старая знаёмая Ганна, якую ў школе ён даймаў сваімі выхадкамі.

Рэжысёр — Ціль Швайгер. **У ролях:** Ціль Швайгер, Нора Чырнер, Юрген Фогель, Уладзімір Клічко.

Тэлесеткі

ЗОРКА «PLAYBOY» ПРАЦЯГНЕ ВЕСЦІ МУЗЫЧНЫ СУД

З 5 лютага на АНТ пачынаецца другая частка шоу «Музычны суд». Пасяджэнні яго пад «сакратарствам» вядучай Сашы Паўлавай — колішняй зоркі часопіса «Playboy» — цяпер пройдуць па змененых правілах.

Прыём песень для другога сезона «Музычнага суда» пачаўся ў студзені, і ўсяго за месяц на адрас тэлеканала паступіла больш як 400 заявак з розных краін — Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, Польшчы, Іспаніі... З дасланых дэма-версій экспертная камісія адабрала для ўдзелу ў праекце ўсяго 15.

Такім чынам, у эфір выйдзе тры праграмы, у кожнай з якіх прагучыць па 5 песень у выкананні «Новых галасоў Беларусі». Толькі адну з кампазіцый суддзі абяруць для ўдзелу ў фінале, аднак яшчэ адну змогуць «працягнуць» туды гледачы. Праўда, у другім сезоне глядацкае галасаванне будзе доўжыцца ўсяго 10 хвілін падчас праграмы, а не цэлы тыдзень, як гэта было раней. У фінале ж, дзе сустрэнуцца 6 фаварытаў журы і публікі, пераможцу вызначыць тэлефоннае галасаванне тэлегледачоў. Аўтару гэтай кампазіцыі тэлеканал падорыць гасцявую паездку (на дваіх) на «Еўрабачанне-2010» у Нарвегіі. Адну такую пуцёўку ўжо выйграў украінскі аўтар-аматар Яўген Малашка з кампазіцыяй «Don't play in love».

А вось з абяцанымі на пачатку праекта 50 тысячамі долараў сітуацыя іншая. Гэта пытанне, паведамілі «Звяздзе» на АНТ, пакуль што адкладзена на пэўны час. «Кіраўніцтва тэлеканала ні ў якім разе не адмаўляецца ад сваіх слоў, — заўважае прэс-сакратар АНТ Таццяна Курбат. — Аднак пакуль што мы не маем права займацца конкурсам «Еўрабачанне», бо не з'яўляемся членам Еўрапейскага вяшчальнага саюза — і значыць, не можам правесці адбор песні для гэтага конкурсу і выплаціць узнагароджанне аўтару песні. Калі тэлеканал увойдзе ў склад ЕВС, мы абавязкова вернемся да разгляду гэтага пытання».

Што да праекта «Музычны суд», ён мае вельмі неблагія рэйтынгі і абяцае стаць доўгайграючым. Пасля другой часткі варта чакаць трэцюю, чацвёртую і г.д., прычым надалей, магчыма, праект крыху зменіць фармат і будзе адбіраць найлепшыя песні розных стыляў і кірункаў.

...Дарэчы, на афіцыйным сайце www.ont.by арганізатары шоу абяцаюць змясціць відэаблогі з пікантнымі падрабязнасцямі закуліснай часткі праекта, якія не трапілі ў эфір, — напрыклад, як аўтары разам з выканаўцамі перад выхадам на сцэну распяваюцца... у прыбіральні, што абмяркоўваюць у зачыненым пакойчыку паміж сабой члены журы і г.д.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.



Фота Сяргея ЧОРНАГА.

Факт

У «ПЛЮСЕ» — ТОЛЬКІ МІНСК

Паводле папярэдніх звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, за мінулы год колькасць насельніцтва Беларусі скарацілася на 13 тысяч чалавек. Пры гэтым асноўнай прычынай тут зноў сталі так званыя «натуральныя страты».

Як сведчыць статыстыка, на працягу мінулага года ў краіне нарадзілася 109,8 тыс. дзяцей, што перавысіла паказчык пазамінулага года на 1,9 тыс. чалавек. Але адначасова ўзрос і ўзровень смяротнасці — летась пайшлі з жыцця 135,1 тыс. жыхароў Беларусі. Такім чынам, натуральнае сальда атрымалася адмоўным і агульнае падзенне колькасці насельніцтва замарудзіў толькі міграцыйны прырост. У 2009 годзе на сталае месца жыхарства ў краіну прыехалі 19892, тады як з'ехалі — 7643 чалавекі.

Як сведчыць статыстыка, у пачатку года ў Беларусі пражывала 9 млн 480,2 тыс. чалавек. Пры гэтым адзіным рэгіёнам, які павялічыў колькасць насельніцтва, была сталіца — па стане на 1 студзеня тут налічваўся 1 млн 834,2 тыс. жыхароў. Насельніцтва Гомельскай вобласці складала 1 млн 438,3 тыс., Мінскай вобласці — 1 млн 418,9 тыс., Брэсцкай — 1 млн 398,7 тыс., Віцебскай — 1 млн 228,6 тыс., , Магілёўскай — 1 млн 91,9 тыс., Гродзенскай — 1 млн 69,6 тыс. чалавек.

Сяргей ГРЫБ.

У ГОНАР НІНЫ МАЦЯШ

Брэсцкі аблвыканкам прыняў рашэнне Белаазёрскай гарадской бібліятэцы прысвоіць імя Ніны Мацяш, слыннай беларускай паэткі, ганаровага грамадзяніна горада Белаазёрска. Зроблена гэта па хадайніцтве Бярозаўскага райвыканкама.

Яна СВЕТАВА.

АНТОНАЎКІ ЗАБЫТЫ ПАХ

Зіма, а на рынках рознай садавіны хапае. Цытрусавыя, бананы, ківі, а побач ляжаць яблыкі: «Антэй», «Спартан», «Аўксіс»... Плады выглядаюць хораша, але іншым разам абыдзеш увесь рынак і не знойдзеш там антонаўкі, цітаўкі ці малінаўкі — яблыкаў знаёмых з маленства.

Хто памятае старыя сады «панскіх часоў» і паспытаў з іх яблыкаў і грушаў, той, параўнаўшы тагачасную садавіну з сённяшнімі, замежнымі гатункамі, аддаў бы перавагу першым, хоць іншым разам здаецца, што такога выбару розных гатункаў, як у наш час, ніколі не было.

Жыццё змянілася, і сады з агромістымі дрэвамі адыходзяць у небыццё. Садаводства стала інтэнсіўным, пастаўлена на прамысловую аснову і ўжо пакупнікам прапаноўваюцца саджанцы: «Глостэр», «Айдарэд», «Джоналголд»... Нязвычныя для мясцовага вуха назвы, але яны рэкламуюцца як самыя-самыя.

Яблыкі замежных гатункаў прыцягваюць увагу сваім выглядам — нібы з воску зробленыя ды і ляжаць доўга. Прадаецца шчэпка, а на ёй вісіць здымак будучых яблыкаў ці той яблык ляжыць побач, яго нават можна памацаць, і ўжо хочацца купіць такую яблыньку — спакуса вялікая.

Іншым разам пакупнік здзіўляецца, асабліва калі ён немаладога веку: «Як такія яблыкі могуць да вясны ляжаць — і каб без ніводнай плямкі?»

Але калі яблык мае прыгожы выгляд і ляжыць доўга, гэта не значыць, што ён такі ж смачны — сакавіты і духмяны. У кожным гатунку абавязкова ёсць свае плюсы і мінусы.

Яблыкі старадаўняй селекцыі маюць сваю ярка выражаную адметнасць. Напрыклад, «Пепін літоўскі» (не памятаю калі яго апошні раз бачыў) дужа сакавіты, а дробныя яблыкі аж свяціліся на дрэве, багата ўсыпаным тым гатункам. «Цыганка» — буйныя, бурачковага колеру яблыкі, ляжалі да вясны без усякага спецсховішча. Аднойчы на рынку хацеў гэты гатунак купіць, ды не знайшоў. Прадаўцы-садаводы не ведалі такога.

А што датычыцца «Антонаўкі», то яна вытрымае любую канкурэнцыю. І тым не менш, «Антонаўку» ў перспектыве можна заносіць у Чырвоную кнігу. Адзін з самых старадаўніх гатункаў можа знікнуць.

Лепш за антонаўку ніводны яблык не пахне. Для замочкі, зноў жа, найлепш падыходзяць антонаўкі.

Так, гэтыя яблыкі захоўваюцца да Новага года, бо ў кожнага гатунку свой час. Ніхто ж не спадзяецца, што Белы наліў будзе ляжаць да кастрычніка.

Размова ў нас ідзе пра «Антонаўку звычайную», бо сёння за «Антонаўку» выдаюць каля 17 відаў яблык. І калі антонаўкамі называюць яблыкі чырвонага колеру, то цяжка паверыць, што гэта сапраўды «Антонаўка». У нас яна толькі жоўта-зялёная.

Пішуць, што І. Мічурын сваімі эксперыментамі сапсаваў «Антонаўку». У маім садзе растуць дзве антонаўкі, але яны былі пасаджаны яшчэ да вайны, за «польскім часам», і рукі вялікіх селекцыянераў іх не краналі.

А яблыкі замежнай селекцыі ў гэтым плане ўніверсальныя, але ж і па смаку ў іх разбежка неістотная.

У садаводстве сёння самае важнае — каб яно давала максімальны прыбытак. Калі яблык доўга не ляжыць і не мае эфектыўнага знешняга выгляду, то вытворцаў такі гатунак не цікавіць. А смак і пах яблыка хоць і мае значэнне, але не вызначальнае.

З высокіх дрэў здымаць ураджай даволі складана. Не на кожную галіну залезеш, ды і драбіны бываюць кароткімі. Можна зрабіць прыстасаванне на тычцы і здымаць яблыкі па адным, альбо абтрэсці іх, але ж гэта не выйсце. Прасцей кажучы, з такімі яблынямі ў наш імклівы час адзін клопат, і таму сёння аддаецца перавага нізкаросламу саду.

Яблыні на карлікавым падвоі займаюць мала месца, хутка пачынаюць плоданасіць і ўраджай з іх збіраць вельмі лёгка. Але ўсе гэтыя «клоны» патрабуюць добрай глебы і догляду, менш зімастойкія і жывуць мала — у межах 15 гадоў.

Новае і перадавое перамагае, асабліва калі справа датычыцца зніжэння сабекошту прадукцыі. І тут вытворцы навязваюць спажыўцам свае правілы гульні. А наш пакупнік яшчэ не пераборлівы. Гэта ў Германіі спажывец патрабуе экалагічна чыстае прадукцыі, і ўжо 20 працэнтаў фермераў уцягнуліся ў яе вытворчасць.

Але вернемся да нашай «Антонаўкі» і паслухаем, што скажа **дырэктар гадавальніка «Зубкі», што ў Клецкім раёне, Іван ІЛЬЮКЕВІЧ**.

— З усіх гатункаў яблыкаў «Антонаўка» для харчавання дзяцей найлепш падыходзіць, бо ад яе няма дыятэзу. А калі дзеці хворыя, то «Антонаўку» ніякія яблыкі не заменяць. Вельмі каштоўны гатунак.

— Іван Сцяпанавіч, але ж сёння «Антонаўка» не ў пашане.

— Наш гадавальнік — адзіны астравок, дзе засталася «Антонаўка». Некалі была яшчэ «Камянічка», якая адносілася да гэтага гатунку, то яна ляжала да красавіка, але апылілася з іншымі гатункамі і знікла. Становіцца складана зберагчы мясцовыя гатункі, вось мне пастаянна напамінаюць, каб старыя сады выкарчоўваў.

— Гатункі замежнай селекцыі ў нас вельмі папулярныя, а як вы ставіцеся да іх?

— Смакавыя якасці ў пладоў замежнай селекцыі саступаюць смаку мясцовых. Там сады апрацоўваюць хімікатамі да 24 разоў у сезон, а гэта адбіваецца на смаку. І з нашай «Антонаўкай» тыя яблыкі ў гэтым плане нават параўнаваць нельга. Але ж у чалавека натура такая, што найперш, давярае сваім вачам. Убачыў вялікае ды чырвонае — то і адкусіць хочацца.

— Можна зрабіць нейкія захады, каб зберагчы для будучых пакаленняў гатункі яблыняў і грушаў, якія дасталіся нам ад продкаў? Ці ёсць магчымасць дрэвы зрабіць нізкарослымі, каб яны не выпадалі з інтэнсіўнай вытворчасці?

— Над гэтым неабходна працаваць сістэматычна. Тую ж «Антонаўку» можна прышчапіць на карлікавы падвой, але тады яна будзе слабей развівацца.

— Апошнім часам садаводы скардзяцца, што ёсць праблема са збытам яблыкаў. Як у вас?

— Праблема ўзнікла з прычыны канкурэнцыі. У Беларусі многія ф

Смак Францыі ў Беларусі

Праз словы і стравы яго можна будзе адчуць на XVII Мінскай міжнароднай кніжнай выставе 10—14 лютага.

Таму што менавіта Францыя сёлета стане на ёй ганаровай госцяй, першай з краін Заходняй Еўропы. Французскі стэнд зойме даволі значную плошчу, таму што краіна прадэманструе кніжныя навінкі не толькі ў перакладзе на рускую мову, але і арыгінальныя франкамоўныя. Гэта ацэняць тыя, хто валодае французскай: нават у сталіцы Беларусі няма месцаў, дзе можна набыць кнігі на французскай мове. Але наведвальнікаў запросяць у дні працы выставы паразмаўляць не толькі пра французскую літаратуру, але і пра Францыю, пра тыя месцы, якія могуць прывабіць нашых суграмадзян. Прывабліваць французы збіраюцца з густам: аўтограф-сесіямі з літаратарамі, гульнямі, розыгрышам прызоў і нават дэгустацыяй французскіх прадуктаў. Краіна, якая «ўмее прыгожа жыць», збіраецца павучыць гэтаму нас.

Што дарэчы, таму што пакуль ніхто не вырашыў раз і назаўсёды праблему, як прыцягнуць чытача да беларускай кнігі. Хоць кніжныя выставы-кірмашы гэтаму павінны спрыяць: уваходны квіток у выставачны цэнтр, што на вуліцы Янкі Купалы, купляць не трэба, у адрозненне, напрыклад, ад падобных мерапрыемстваў у той жа Расіі ці Германіі, дзе ўваход каштуе 30 еўра.

— Нам прыемна, што гэта першая выстава ў шэрагу суветных кніжных выстаў. Нам вельмі прыемна, што мы пачынаем год. Гэта вельмі стабільная, добра падрыхтаваная выстава, якая з кожным годам пашыраецца, бо цікавасць да яе расце, — адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар ЛАПЦЁНАК**. — Штогод мы больш шырока знаёмім наведвальнікаў з кніжнай прадукцыяй якой-небудзь краіны: ганаровымі гасцямі ўжо былі Расія, Украіна, Ізраіль, Казахстан. Традыцыя будзе ўмацоўвацца, і ўслед за Францыяй ужо ў наступным годзе мы пакажам кнігі Германіі.

Аднак вядомыя госці да нас сёлета прыедуць не толькі з Францыі. Арганізатары чакаюць з Расіі Міхаіла Велера, вядомага не толькі па кнігах, але і па з'яўленні на тэлеэкране. Прыедуць пісьменнікі з Таджыкістана, Латвіі, Літвы і іншых краін. У іх будзе магчымасць сказаць сваё слова падчас «круглага стала», дзе мяркуецца паразмаўляць пра стасункі беларускіх пісьменнікаў з літаратарамі іншых краін.

Выстава абяцае быць прадстаўнічай. Паводле слоў **выканаўчага дырэктара Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу Дзмітрыя МАКАРАВА**, экспазіцыйныя плошчы сёлета нават павялічацца на 5 %.

І не павінна згубіцца ў гэтай прасторы прадукцыя беларускіх выдавецтваў. Беларускія кніжкі трапляюць штогод у спіс ста найлепшых кніг у свеце, падкрэсліў Ігар Лапцёнак. І летась у беларускіх кнігавыдаўцоў былі поспехі, хоць мінулы год быў вельмі складаны з пэўных фінансава-эканамічных прычын.

Выстава кнігі

— Нашы паліграфічныя магутнасці настолькі багатыя і моцныя, што наша краіна можа іх запоўніць толькі на 30 працэнтаў. Таму мы прапаноўваем далучыцца партнёрам з замежжа, якія маюць філіялы ў Беларусі. Ёсць заказчыкі з Украіны, Прыбалтыкі, Польшчы. Усе нашы 84 суб'екты гаспадарання выдалі летась 12 тысяч 885 назваў кніг і брашур агульным тыражом 52 мільёны экзэмпляраў. Гэта крышачку менш, чым у папярэднім годзе. На беларускай мове летась было выдадзена 1084 найменні кніг і брашур агульным тыражом 5,26 мільёна экзэмпляраў. З іх дзяржаўныя выдавецтвы выдалі 159 назваў тыражом 1,2 мільёна асобнікаў. У параўнанні з мінулым годам беларускамоўных кніг выйшла больш як па тыражы, так і па назвах. Відаць, попыт расце. Тут не апошнюю ролю адыграла тое, што мы аднавілі фінансаванне з бюджэту выданняў серыі «Школьная бібліятэка», якая стала добрым падмуркам для нашых выдаўцоў. На рускай мове выдадзена 11 тысяч 10 найменняў агульным тыражом 45 мільёнаў экзэмпляраў, гэта крыху больш за 85 % ад агульнага тыражу. Нягледзячы на тое, што ў нас дзяржаўнае двухмоўе, большая частка выданняў ажыццяўляецца на рускай мове, дзеля таго, каб мы маглі выдадзеныя кнігі распаўсюджваць на абшарах іншых бліжніх краін.

Па словах намесніка міністра інфармацыі, з вялікай колькасці нашых выдавецтваў прыкладна 25 робяць сёння галоўны ўплыў на справу кнігавыдання ў краіне.

Ларыса ЦІМОШЫК.

31 студзеня — Дзень айчыннай навукі

Арыгінальны ноўтбук ад калектыву НДІ ЭВМ

На спецыяльнай выставе да Дня навукі ёсць што паказаць з апошніх цікавых распрацовак калектыву НДІ ЭВМ. У прыватнасці, тут дэманструецца ноўтбук, прызначаны для эксплуатацыі ў самых неспрыяльных умовах, а таксама мае высокую ступень абароненасці ад несанкцыянаванага доступу да яго базы звестак, да змешчанай у ім інфармацыі. Ноўтбук прызначаны для эксплуатацыі ў дзяржаўных структурах, а таксама ў так званых нестандартных умовах.

Як адзначаюць спецыялісты, аналагічных распрацовак на постсавецкай прасторы пакуль што няма, ноўтбук выдатна «ўкладваецца» ў формулу «цана плюс якасць» і павінен быць добра запатрабаваным як на айчынным, так і на расійскім рынках. Канструкцыйная база ноўтбука практычна цалкам выкананая ў НДІ ЭВМ, гэта значыць, мае айчыннае паходжанне (у ім выкарыстаны толькі імпартны працэсар). Як адзначае Яўген Астамухаў, кіраўнік адпаведнага падраздзялення НДІ ЭВМ, дзе і распрацоўваўся ноўтбук, адным з важкіх вынікаў гэтай працы з'яўляецца таксама тое, што людзі, якія былі занятыя ў ёй, паверылі ў свае сілы, паверылі ў тое, што яны могуць рабіць «такія рэчы»... Гэты арыгінальны ноўтбук НДІ ЭВМ да канца сакавіка павінен прайсці дзяржаўныя выпрабаванні, у паспяховасці якіх тут не сумняваюцца.

(Пра сённяшнюю дзейнасць калектыву НДІ ЭВМ і яго арыгінальныя распрацоўкі, якія ён выканаў або выконвае апошнім часам, чытайце ў адным з найбліжэйшых нумароў газеты.)

Іван АЛЯКСАНДРАЎ.

Андрэй ЯСЮЧЭНЯ:

«ІСТОТНАГА ПАДАРАЖЭННЯ БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ Ў МІНСКУ НЕ БУДЗЕ»

Праекты дэталёвай планіроўкі кожнага раёна, паводле адкарэктаванага генплана Мінска да 2030 года, ужо «пакрываюць» каля 80 працэнтаў тэрыторыі галоўнага горада краіны, паведаміў учора журналістам намеснік старшыні Мінгарвыканкама Андрэй ЯСЮЧЭНЯ.

Абноўленыя вуліцы і новыя раёны

У першую чаргу змены закрануць прыватны жыллёвы сектар. Цяпер у шэрагу жылых раёнаў горада ажыццяўляецца маштабная рэканструкцыя з адпаведным зносам старых дамоў і будаўніцтвам новых аб'ектаў. Такія мерапрыемствы прадугледжаны па вуліцах Дзяржынскага і Маякоўскага, у зоне вуліцы Багдановіча. Распрацоўваецца план рэканструкцыі вуліцы Адэскай і шэрагу іншых месцаў, дзе будзе зроблена істотная перапланіроўка жылых прыватных пабудоў. Цяпер цалкам запраектаванае, знаходзіцца на дзяржэкспертызе і плануецца да рэалізацыі ўзвядзенне новых раёнаў Паўночны і Шчамысліца ўжо сёлета, а раёна Дзегцяроўка — у наступным годзе. Там мяркуецца пабудаваць сучасныя жылыя комплексы разам з неабходнай сацыяльнай інфраструктурай, школамі, дзіцячымі садкамі, паліклінікамі, гандлёвымі аб'ектамі і развітой транспартнай сеткай. Будаўніцтва пазаквартальных інжынерных сетак і камунікацый у Паўночным плануецца пачаць сёлета вясной, узвядзенне першага жылога дома — на працягу года, а масавае будаўніцтва жылля — у пачатку 2011 года. У другой палове гэтага года пачнецца будаўніцтва магістральных сетак у мікрараёне Шчамысліца, а першыя дамы там будуць закладзены ўжо ў другой палове 2011 года. Інвестыцыйныя праекты прадугледжваюць будаўніцтва адміністрацыйных будынкаў, многафункцыянальных комплексаў, паркінгаў, буйных гандлёвых цэнтраў. Да пачатку чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе ў горадзе падрыхтавана асобная праграма развіцця, якая павінна забяспечыць аператыўную сувязь паміж спартыўнымі аб'ектамі (Мінск-Арэна і Лядовая арэна ў Чыжоўцы) і зонай адпачынку спартсменаў і будучых турыстаў. Будуць зроблены дадатковыя транспартныя развязкі, арганізавана пашырэнне асобных вуліц, будаўніцтва новых гасцініц, разлічаных на размяшчэнне да 8 тысяч чалавек.

Новы калектарны цэнтр і трэцяя лінія метро

Цяпер рэканструююцца і мяняюцца ў Мінску старыя камунальныя аб'екты ліўневай каналізацыі, будуецца новы калектарны цэнтра, каб пры моцных дажджах выключыць затапленне вуліц горада. Пашыраны калектарны цэнтр звяжа пад горадам усе ліўневыя сцёкі і будзе выводзіць дажджавую ваду за горад у раку Свіслач. Будаўніцтва калектарнага цэнтра запланавана завяршыць да 2015 года.

Аператыўнымі тэмпамі працягваецца будаўніцтва новых ліній метро. У 2012 годзе плануецца здаць у эксплуатацыю тры новыя станцыі (Грушаўка, Міхалова, Пятроўшчына) па праспекце Дзяржынскага. Зараз праектуецца трэцяя лінія метро, якая пройдзе ў напрамку плошчы Казінца, у тым ліку пад тэрыторыяй аэрапорта «Мінск-1», на месцы якога запланавана пабудаваць жылы раён Мінск-Сіці. Метро будзе праходзіць пад чыгункай, адміністрацыйнымі будынкамі. Таму будаўніцтва тут плануецца ажыццяўляць падземным спосабам. Толькі самі станцыі метро будуць будавацца адкрытым спосабам. Да пачатку верасня запланавана завяршыць рэканструкцыю будынка цырка.

Рост цэнаў для чаргавікоў — за год не больш як на 14 працэнтаў

Кошт будаўніцтва жылля ў панэльных дамах Мінска для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па новых дагаворах сёлета склаў 1,8—1,9 мільёна рублёў за квадратны метр. Сабекошт будаўніцтва жыллёвага квадрата ў маналітных дамах складае ўжо ад 2,6 да 2,8 мільёна рублёў. Больш дарагія маналітныя і камбінаваныя каркасныя дамы ўзводзяцца галоўным чынам па лініі долевага будаўніцтва, а для чаргавікоў прапаноўваюцца кватэры ў панэльных дамах.

У пачатку года ў сталіцы назіраўся невялікі рост сабекошту будаўніцтва жылля, які быў выкліканы павелічэннем стаўкі ПДВ на 2 працэнты. Толькі за студзень сабекошт жыллёвага квадрата павялічыўся на 1,8 працэнта. Аднак Андрэй Ясючэня ўпэўнены, што надалей рэзкага падаражэння будаўніцтва жылля не прагназуецца. Намеснік старшыні Мінгарвыканкама ўпэўнены, што з улікам інфляцыі, магчымага падаражэння будаўнічых матэрыялаў і іншых фактараў, максімальнае павелічэнне кошту будаўніцтва жылля ў Мінску не павінна перавысіць 14 працэнтаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ДЗЕНЬ ДЛЯ КОЖНАГА З НАС

27 студзеня ў рэспубліканскім Палацы культуры ветэранаў у Мінску сабраліся самыя розныя людзі: маладыя і старыя, школьнікі і дыпламаты, вучоныя і пенсіянеры, даследчаныя і мала знаёмыя з тэмай, якой было прысвечана мерапрыемства. Са мной побач сядзелі два шаснаццацігадовыя падлеткі, і я бачыла іх вочы, якія ў самым пачатку вечарыны сталі сур'ёзныя і засяроджаныя. Тое, пра што казалі людзі са сцэны, нікому немагчыма ўявіць. Але можна было адчуць. Адчуць, як страшнае, невыразнае, чорнае, невытлумачальнае дакранаецца да тваёй душы. Людзі назвалі гэта халакост. Ніхто не ў сілах гэта паказаць. І, напэўна, лягчэй было б пра гэта не думаць, не ўнікаць, не спрабаваць зразумець. Але — нельга. Бо гэта было. А значыць, гэта магчыма. І вось, каб не паўтарылася, тыя, хто моцныя духам, збіраюцца і ўзгадваюць, зноў і зноў называюць лічбы, зноў і зноў перажываюць холад дакранання, зноў і зноў запальваюць свечкі... Каб слабым іх светам асвяціць бездань, каб прагнаць холад жаху, каб дазволіць сабе жыць, кахаць, бегаць па крамах, любавацца іскрыстым паветрам, смяяцца і спяваць... І не дазволіць ненавідзець. Не дазволіць сабе быць абыякавым.

— Гэты дзень — для кожнага з нас, — сказаў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Эдуард ШАПІРА**. — Гэты дзень — магчымасць вырашыць усе пытанні, усе спрэчкі. Магчымасць узгадаць мінулае для стварэння лепшай будучыні.

Міжнародны дзень памяці ахвяраў халакоста сусветная грамадскасць адзначае ў пяты раз. Ва ўсіх краінах праходзяць мемарыяльныя цырымоніі, памятныя канцэрты, адкрываюцца выставы, прэзентуюцца кнігі. 27 студзеня 2010 года ў польскім Асвенціме (у час вайны — Аўшвіц-Біркенаў) сабраліся тысячы яўрэяў з розных краін свету, першыя дзяржаўныя асобы з Польшчы і Ізраіля, афіцыйныя дэлегацыі з іншых краін. У Берліне пазаўчора старшыня Саюза грамадскіх аб'яднанняў і абшчын Беларусі Леанід Левін адкрыў выставу, прысвечаную ахвярам халакоста...

— ААН сваёй рэзалюцыяй 2005 года, якая пастанавіла штогод адзначаць Дзень памяці, не толькі пацвердзіла сваю гатоўнасць ушаноўваць памяць ахвяраў халакоста, але і сваю рашучасць змагацца за правы чалавека, змагацца супраць антысемітызму, рэлігійнай нецярпімасці і расавых прымхаў, — сказаў на памятнай вечарыне ў Мінску **прадстаўнік ААН у Беларусі Антоніус БРУК**.

У знак памяці пра больш чым 2,5 мільёна яўрэяў, якія загінулі на тэрыторыі цяперашніх краін СНД і Балтыі, у памяць пра амаль 6 мільёнаў яўрэяў, якія загінулі на тэрыторыі ўсёй Еўропы, і ў знак гатоўнасці зрабіць усё магчымае, каб не дапусціць паўтарэння падобнай трагедыі, прадстаўнікі пасольстваў Расіі, Украіны, Літвы, Малдовы, дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь і прадстаўнік яўрэйскай абшчыны ў Беларусі запалілі сімвалічныя свечкі памяці. І кожны назваў лічбы забітых: 100 тысяч нявінных мужчын, жанчын і дзяцей у мінскім гета, 800 тысяч — на тэрыторыі Беларусі, 250 тысяч — у лагерах Малдовы, паўтара мільёна дзяцей...

— Аднойчы армянскі журналіст, каб уявіць сабе хоць неяк, што стаіць за гэтымі лічбамі, узяў шарыкавую ручку і стаў пісаць, ён пісаў лічбы і толькі лічбы, але за кожнай — чалавечае жыццё. Апошняй стала 5 820 960 — менавіта столькі жыццяў, згодна з Яўрэйскай энцыклапедыяй, забралі страшныя гады халакоста. У выніку выйшла кніга «Лік бездані», яна мае 848 старонак, на якіх толькі лічбы, суцэльнымі радамі, без знакаў прыпынку, без прабелаў, без літар, — расказала **старшыня Рэспубліканскага фонду «Халакост» Іна ГЕРАСІМАВА**. — І сёння мы дзякуем армянскаму народу за тое, што ён выхаваў сына, які змог увабраць у сябе боль іншага народа, іншых людзей, і вось так яе выказаць. Гэта кніга пераварочвае душу.

На памятнай вечарыне ў Мінску былі прэзентаваныя яшчэ два выданні. Адно з іх — «На ўцалелым чоўне» Валянціна Скоблы, былога вязня мінскага гета. Дзіцем ён згубіў маці, бацьку і малодшага брата, сам цудам выжыў, апынуўся за мяжой. І ўжо дарослым вярнуўся ў Мінск, сустрэўся з многімі былымі вязнямі гета, сабраў іх успаміны... Свой архіў аўтар падарыў Музею гісторыі і культуры яўрэяў у Беларусі Мінскага яўрэйскага абшчыннага дома.

Жывыя сведкі... Іх застаецца ўсё менш. У Беларусі жыве больш за 200 былых вязняў Асвенцыма. Амаль усе яны тады былі дзецьмі. Гэтыя людзі сабралі свае ўспаміны і толькі нядаўна, у 2009 годзе, выдалі кнігу, якую так і назвалі: «Лагер смерці Асвенцім: жывыя сведчанні ў Беларусі».

— Няхай людзям застанецца памяць пра нашы пакуты, — мяккім голасам пракаментавала адна з аўтараў кнігі.

Калі арганізатары вечарыны папрасілі павітаць былых вязняў лагераў смерці, якія прыйшлі на мерапрыемства, у поўнай зале падняліся каля 25 чалавек. Потым віталі тых, хто рызыкуючы сваім жыццём, выратоўваў яўрэяў — 9 зусім старых людзей...

Леанід РУБІНШТЭЙН, былы вязень Мінскага гета і трох лагераў смерці.

Яшчэ адна важная падзея адбылася на сустрэчы ў Палацы культуры ветэранаў. Юбілейны медаль «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», якім у 2008 годзе пасмяротна быў узнагароджаны адзін з лідараў падполля ў мінскім гета Ханаан Гусінаў, быў уручаны пляменніку героя — Ілью Гусінаву. Гэта 9-я ўзнагарода з 21, якую ўдалося перадаць сваякам пасмяротна ўзнагароджаных удзельнікаў Супраціўлення. Спадчыннікаў астатніх падпольшчыкаў, на жаль, знайсці пакуль не ўдалося.

Памятнае мерапрыемства ў Міжнародны дзень памяці ахвяраў халакоста арганізавалі ў Беларусі Прадстаўніцтва ААН і Рэспубліканскі фонд «Халакост». Вечарына доўжылася паўтары гадзіны. На ёй гучалі малітвы і песні, вершы і выступленні, і лейтматывам усяго — светлая надзея. Бо халакост прадэманстраваў свету не толькі бездань чалавечага зла, але і трыумф чалавечага духу. Нездарма сімвалам Дня памяці стаў калючы дрот, які пераўтвараецца ў пераплеценыя пяшчотныя белыя кветкі...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Вольгі ЛАСКІ.

Свечкі памяці.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

АЎТАРСКІ-10

Аб'яўляем яго з нормай першага спартыўнага разраду па шашках і на прызы майстра ФМЖД Віктара Шульгі (Мінск), якому належаць усе 15 заданняў. Падаём **першае** з іх:

Белыя: a7, b4, c5, f2, f6, g5 (6). **Чорныя:** b2, b6, d8, e7, h2, h4 (6). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

АЎТАРСКІ-9

А яго працягваем **заданнем № 6** міжнароднага грасмайстра Уладзіміра Матуса (Масква):

Белыя: 9, 14, 19, 24, 37, 41, 45, 46, 47 (9). **Чорныя:** 2, 12, 23, 28, 32, 34, 35, 38, 40 (9). Перамога белых.

РЭСПУБЛІКАНСКІ-21

Ён з'яўляецца адкрытым і правадзіцца па складанні 100-клетачных мініяцюр. Кожны жадаючы можа даслаць дзве свае новыя задумкі. Суддзя конкурсу — чэмпіён свету па шашачнай кампазіцыі Уладзімір Матус. Для пяці пераможцаў ён падрыхтаваў прыз — сваю кнігу «Гранды России» (Москва, Графпресс, 2008). Тры прызёры, акрамя таго, атрымаюць дыпломы ГА «Беларуская федэрацыя шашак». Вашы творы чакаюцца да 01. 04. 2010 г. на адрас рэдакцыі газеты альбо на электронны адрас суддзі-каардынатара Віктара Шульгі: shulga-@mail.ru.

ВЫНІКІ БЛІЦ-КОНКУРСАЎ

З улікам знаходжання пабочных рашэнняў і іншых крытэрыяў іх лаўрэатамі сталі: **бліцаў-47 і 50** — Аляксандр Белы (Навапалацк), **бліца-48** — Ігар Ананіч (Гродна) і **бліца-49** — Аляксандр Шурпін (Клімавічы). Іх чакаюць прызы ад аўтараў заданняў: А. Белага і І. Ананіча — ад майстроў Пятра Шклудава (Навапалацк) і Віктара Шульгі (Мінск) адпаведна. А. Шурпіну адпраўляецца часопіс «Горизонты шашек» № 12 (Винница, 2004) — з прызавога фонду грасмайстра СССР Леаніда Вітошкіна (Гомель).

СПАБОРНІЧАЛІ СКЛАДАЛЬНІКІ

Падведзены вынікі чэмпіянату Мінскай вобласці 2009 года па шашачнай кампазіцыі на 64-клетачнай дошцы па правілах рускіх шашак. Ён быў адкрытым і ў ім узялі ўдзел не толькі праблемісты Беларусі, але і Расіі, Украіны, Узбекістана і іншых краін. Ва ўпартай барацьбе перамогу атрымалі ў раздзелах: **камбінацыйных міні-праблем** — Р. Шасцерыкаў (Волгаград), С. Барадаўкін (Гродна) і У. Похіл (Кіраваградская вобласць), **праблем** — М. Ляшкевіч (Мінск), Г. Шасцерыкаў і А. Іваноўскі (Магілёў), **эцюдаў** — Л. Вітошкін, А. Лук'янаў (Тамбоў) і У. Афімін (Сімферопаль) і **задач** — Л. Вітошкін, С. Лойка (Валынская вобласць) і трэцяе месца падзялілі Р. Рудніцкі (Сімферопаль) і І. Вальтэр (Самарканд).

Чэмпіянат праходзіў пад эгідай Мінскага аблвыканкама, а непасрэдным яго арганізатарам і галоўным суддзёй быў майстар Аляксандр Ляхоўскі (Жодзіна).

У **суд г. Навапалацка Віцебскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак грамадзяніна **Кісялёва Андрэя Віктаравіча**, 17 лютага 1968 года нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Полацк, вул. Марыненкі, д. 9, кв. 65.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Кісялёва А.В., паведаміць іх суду г. Навапалацка на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Считать недействительными страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии АЖ №№ 6741241, 8822827, 5852878, страховые сертификаты «Зеленая карта» серии BY 12 №№ 1890461, 1890462, 2964707 СООО «Белкоопстрах».

ЦІ З'ЯВІЦЦА Ў БЕЛАРУСАЎ НА СТАЛЕ ФАРЭЛЬ, АСЕТР І АФРЫКАНСКІ СОМ?

Лаві і еш сваё!
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Паводле інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, кожны беларус спажывае ў сярэднім 17,8 кілаграма рыбы і рыбапрадуктаў у год. А, напрыклад, у Японіі спажыванне рыбы складае 72 кілаграмы на душу насельніцтва. Ці не таму ў гэтай краіне самая высокая ў свеце працягласць жыцця?

РЫБНАЕ МЕНЮ — ПАРАТУНАК ДЛЯ СЭРЦА

Агульнавядома, што багатая на тлушчы і свабодныя цукры дыета правакуе ў чалавека развіццё сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў. Між іншым, у рацыёне беларусаў традыцыйна пераважаюць менавіта тлустыя прадукты, у тым ліку мясныя — з павышаным утрыманнем тлушчаў. А сардэчна-сасудзістыя захворванні займаюць у агульнай структуры смяротнасці насельніцтва адпаведна першае і другое месцы. Па меркаванні дыетолагаў, для здароўя рыбнае меню куды больш карыснае за мясное: рыба змяшчае тлустыя амега-кіслоты, якія перашкаджаюць адкладанню ў сценках артэрый халестэрыну, папярэджваюць склейванне трамбацытаў у крыві, зніжаючы тым самым верагоднасць утварэння ў сасудах тромбаў. Падлічана, што замена паловы мяснога рацыёну на рыбу можа зменшыць рызыку развіцця ў чалавека атэрасклерозу і, адпаведна, інсультаў на 30—40 працэнтаў. Даказана таксама, што рыба змяняе ў чалавека ступень імуннай рэакцыі, стабілізуе ўзбуджальнасць сэрца і зніжае рызыку раптоўнай смерці ад спынення галоўнага нашага «матора».

— Калі ў чалавека ўжо ёсць праблемы з сардэчна-сасудзістай сістэмай, для таго, каб спыніць далейшае прагрэсіраванне хваробы, яму трэба спажываць 4-5 порцый рыбы на тыдзень, — паведаміў падчас «круглага стала», прысвечанага перспектывам развіцця ў Беларусі прамысловага рыбаводства, **загадчык кафедры гастраэнтэралогіі і нутрыцыялогіі БелМАПА, галоўны пазаштатны дыетолаг Міністэрства аховы здароўя прафесар Юрый МАРАХОЎСКІ.** — А для здаровых людзей для прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў рэкамендуецца спажываць рыбу хоць бы двойчы на тыдзень.

Медыкі сцвярджаюць, што мяса рыбы — адна з галоўных крыніц высакаякаснага бялку, які максімальна засвойваецца арганізмам і ўтрымлівае незаменныя амінакіслоты, што не сінтэзуюцца ў нашым арганізме і якія чалавек павінен атрымліваць разам з прадуктамі харчавання. Напрыклад, у Францыі адзін кілаграм мяса судака прыняты за эталон каштоўнасці бялковых прадуктаў жывёльнага паходжання. Нездарма менавіта мясам судака кармілі касманаўтаў. Са 100 грамаў рыбнага бялку, які з'яўляецца будаўнічым матэрыялам для нашых клетак, арганізм чалавека засвойвае прыкладна 40 грамаў, са 100 грамаў свініны — 20 грамаў, а са 100 грамаў ялавічыны — 15 грамаў. Калі на засваенне бялку прэснаводнай рыбы арганізму чалавека патрабуецца 1,5-2 гадзіны, то пераварванне адбіўной з ялавічыны займае ад 5 да 7 гадзін. Асабліва багатыя на бялок карп, таўсталобік і шчупак.

Вядома таксама, што тлустыя поліненасычаныя кіслоты амега-3, што ўтрымліваюцца ў рыбе, валодаюць выражаным супрацьракавым уздзеяннем, нармалізуюць работу мозга, дапамагаюць пры хваробе Альцгеймера, гіпертаніі, цукровым дыябеце, рэўматызме і падагры. Да таго ж рыба — скарбонка ўсялякіх хімічных элементаў і спалучэнняў, без якіх арганізм чалавека існаваць проста не можа: яна ўтрымлівае фосфар, селен, серу, цынк. Цынк, напрыклад, валодае магутнымі антывіруснымі і антытаксічнымі ўласцівасцямі. Селен — магутны антыаксідант і г.д.

Яшчэ адзін немалаважны фактар — гэта нізкая каларыйнасць рыбы, нават тлустых яе гатункаў. Гэта ежа падыходзіць для людзей, якія прытрымліваюцца дыеты і сочаць за сваёй вагой. Асабліва для дыетычнага харчавання падыходзіць мяса шчупака, паколькі не ўтрымлівае халестэрыну. Да таго ж мяса шчупака вельмі карыснае для падтрымання «мужчынскай сілы».

МАРСКАЯ ЦІ САЖАЛКАВАЯ?

— На жаль, але сярод нашых людзей шырока распаўсюджана памылковае меркаванне, што сапраўднай каштоўнасцю з'яўляецца толькі марская рыба. Таму хачу запэўніць усіх, што рачная і сажалкавая рыба ні ў чым не саступаюць па карыснасці марской, а па пэўных параметрах нават яе пераўзыходзяць, — падзяліўся сваім бачаннем праблемы **начальнік аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук па харчаванні Васіль ЦЫГАНКОЎ.** — Тым больш што арганізм любога чалавека больш адаптаваны да прадуктаў і раслін зоны яго пражывання. І калі марская рыба можа быць небяспечнай у алергенным плане, асабліва для дзяцей, то на прэснаводную рыбу гэта пагроза не распаўсюджваецца. Адзіная перавага марской рыбы — высокае ўтрыманне ў ёй такога элемента, як ёд. Але ёд утрымліваецца таксама і ў іншых морапрадуктах, напрыклад, у той жа марской капусце ў яшчэ большай колькасці. Скажыце, ці часта вам даводзілася сустракаць у гандлі марскую рыбу глыбокай замаразкі? Уся марская рыба, якую мне давялося набываць, пасля размаразкі мела выгляд незразумелага рэчыва і ўтрымлівала шмат вадкасці. Таму асабіста я аддаю перавагу беларускай жывой рыбе, вырашчанай у беларускіх рыбалавецкіх гаспадарках.

— Сапраўды, якасць і карыснасць рыбы залежаць ад таго, наколькі хутка і правільна яна была перапрацаваная пасля таго, як яе выцягнулі з мора, — пагаджаецца **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута рыбнай гаспадаркі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір КАСТАВУСАЎ.** — Жыхары марскіх дзяржаў спажываюць рыбу толькі ў свежым ці ахаладжаным выглядзе. А да нас трапляе выключна замаражаная рыба. Нятлустая рыба замарожваецца пры тэмпературы мінус 18 градусаў, тлустая — пры мінус 28 градусах, а асабліва тлустая — пры мінус 30 градусах і ніжэй. Хуткасць замаразкі павінна складаць 2—5 мм у гадзіну. Аднак калі ўлоў — вялікі, то вытворцы штучна паскараюць працэс замаразкі, скарачаючы цыклы замаразкі, у выніку чаго рыба выходзіць замарожанай не да канца і замарожваецца ўжо ў працэсе яе далейшага захоўвання. Такую рыбу лёгка пазнаць на стале, паколькі замаразка пры мінус 18 градусах толькі замаруджвае, але не спыняе канчаткова жыццядзейнасць мікраарганізмаў і плесневых грыбоў. І біяхімічны распад тканак канчаткова не спыняецца: нават у замарожанай знешне рыбе адбываецца раскладанне карысных поліненасычаных тлушчоў і дэнатурацыя бялкоў.

Таму на замарожаную марскую рыбу ўстанаўліваюцца непрацяглыя тэрміны захоўвання: на нятлустыя гатункі — не больш як паўгода, а для тлустых гатункаў — 3 месяцы. Але хто з нас ведае, калі рыба была вылаўленая, колькі яна захоўвалася і пры якіх умовах? Ні ў аднаго прадаўца і пастаўшчыка няма штампу аб даце вылоўлівання рыбы. Між іншым, тэмпература захоўвання павінна адпавядаць тэмпературы замаразкі. Таму не менш важнае значэнне мае таксама правільная транспарціроўка рыбы. На жаль якасць рыбнай прадукцыі, якая паступае на беларускі рынак, вымушае чакаць лепшага. І тая прадукцыя, што не можа трапіць у Еўрасаюз, трапляе на рынкі Беларусі і Расіі. Вось чаму свежая рыба заўсёды будзе мець перавагі перад замарожанай.

КАНКУРЭНЦЫЯ ДЛЯ КАРПА

Цяпер рыбагадоўляй у Беларусі займаюцца 19 спецыялізаваных гаспадарак. У іх распараджэнні знаходзіцца 20 тысяч гектараў штучных сажалак. Летась вытворчасць таварнай рыбы склала 15,7 тысячы тон.

Па словах **дырэктара Дэпартамента меліярацыі і воднай гаспадаркі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоля БУЛЫНІ,** у 2008 годзе насельніцтву было рэалізавана 11,2 тысячы тон рыбы, а ў 2009 годзе гэта лічба склала 13,3 тысячы тон. І вытворчасць, і рэалізацыя рыбы расце, аднак матэрыяльная база гандлёвых арганізацый аказалася непадрыхтаванай да такой колькасці жывой рыбы. Для параўнання: калі рэалізацыяй марской замаражанай рыбы займаюцца 7 тысяч гандлёвых арганізацый, то сажалкавай рыбы — толькі 700 пунктаў, дзе ўсталяваныя акварыумы. Гандаль вядзецца пераважна са спецмашын: штодня па краіне курсіруюць каля 200 машын з надпісамі «Жывая рыба Беларусі». Толькі ў Мінску штодня рэалізуюць жывую сажалкавую рыбу 40 спецмашын.

— Гэта зусім нятаннае задавальненне, — прызнаецца Анатоль Булыня, — тым больш што рыба займае ў цыстэрнах толькі чацвёртую частку, а ўсё астатняе месца займае вада. Гэта робіцца, каб захаваць таварны выгляд і карысныя ўласцівасці жывой рыбы па дарозе да пакупніка. Сярод прадукцыі нашых рыбагадоўчых гаспадарак ільвіную долю (да 87 працэнтаў) займае карп. Вырошчваем мы таксама таўсталобіка, амура, ліня і шчупака. Аднак найбольш перспектыўным кірункам дзейнасці лічым фарэлегадоўлю, асетрагадаўлю і вырошчванне сомавых рыбаў (еўрапейскага і афрыканскага сома). Вытворчасць карпа была стратнай нават у савецкія часы, калі дзяржаўная датацыя на яго вырошчванне даходзіла да 50 працэнтаў. Для вырошчвання карпа патрабуецца 4 кілаграмы камбікорму па цане 1 тысяча за кілаграм. Вырошчваць карпа трэба тры гады. Карп можа быць шэрым, а можа і залацістым — яго смакавыя ўласцівасці напрамую залежаць ад якасці корму. Там, дзе на стадыі дарошчвання выкарыстоўвалася летась цэльнае зерне, карп атрымаўся і прыгожым, і смачным. Але не ўсе гаспадаркі пайшлі на дадатковыя выдаткі. Зусім іншая рэч — гадоўля фарэлі. За два гады можна вырасціць рыбу вагой 2,7 кілаграма, прычым атрымаць і мяса, і ікру адначасова.

У якасці прыкладу Анатоль Булыня прывёў нямецкага фермера, які на плошчы 7 гектараў вырошчвае больш як 100 тон фарэлі і атрымлівае 3,5 тоны ікры. Маленькая Фінляндыя вырошчвае да 12 тысяч тон фарэлі, Польшча — каля 20 тысяч тон. Не адмаўляецца ад штучнага развядзення рыбы і марская Нарвегія, якая вырошчвае 460 (!) тысяч тон фарэлі. У Беларусі летась было вырашчана 50 тон фарэлі (чатыры гады таму — толькі 7 тон). Аднак калі ў Еўропе кіл

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

Крымінал, здарэнні

КРАДЗЯЖЫ НА 50 МІЛЬЁНАЎ

15 крадзяжоў на агульную суму 50 мільёнаў рублёў учынілі з дач грамадзян, крамаў на тэрыторыі Віцебскага, Гарадоцкага, Сенненскага раёна і двух раёнаў Віцебска члены групы зламыснікаў. Падчас следства даказалі, што кралі і аўто. Сярод крымінальнага квартэта быў і грамадзянін Расіі.

Пачалі крадзяжы раней судзімы 24-гадовы наш зямляк і расіянін (рэцыдывіст) з дачы. Потым абрабавалі сельскую краму. І зноў «працавалі» на дачах, а потым стварыўся крымінальны квартэт (усе раней судзімыя), які ажыццяўляў ваяж па крамах вобласці.

Папаліся міліцыянерам, калі выгружалі чарговую партыю скрадзенага ў гараж лідара групы. Цікава, дарэчы, што ён, не маючы пасведчання кіроўцы, ездзіў на аўто сваёй жонкі. Крымінальная справа ў дачыненні да аматараў чужога дабра разглядаецца ў судзе Гарадоцкага раёна.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГАСПАДЫНЯ ЗАГІНУЛА

Вечарам у в. Лясной (Баранавіцкі раён) загарэлася хата, у якой жыла 88-гадовая пенсіянерка.

Старую жанчыну з абгарэлымі рукамі і тварам вынеслі з хаты суседзі. На выклік неўзабаве прыехалі пажарныя і хуткая дапамога. Пенсіянерку выратаваць не ўдалося.

БАЦЬКА ПАПРАКНУЎ І...

Жыхар г. Лунінца прыйшоў дамоў і ўбачыў, што 22-гадовы сын п'е гарэлку са сваім сябрам.

Бацька папракнуў сына, што той не працуе, а вось выпіць любіць. У адказ нашчадак схапіў са стала нож і ўдарыў бацьку, які тут жа і сканаў. Забойца, які ў студзені гэтага года вярнуўся з калоніі, затрыманы.

ПАМЕЖНІКІ ДАПАМАГЛІ

Памежнікі, якія знаходзіліся побач з в. Барысаўка (Кобрынскі раён), пачулі стрэл і пайшлі на яго, неўзабаве яны знайшлі забітага дзіка.

Двух паляўнічых удалося затрымаць, а трэці ўцёк. Браканьераў перадалі дзяржінспектарам, якія высветлілі, што яны з'яўляюцца работнікамі Дзівінскага лясніцтва. У браканьераў канфіскавалі дубальтоўкі, іх чакае буйны штраф.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЛЮБОЎ ДА МАСТАЦТВА?

Тры творы выяўленчага мастацтва невядомага майстра зніклі з неахоўнага будынка культурна-спартыўнага цэнтра вёскі Рассвет Акцябрскага раёна.

Ноччу невядомы выбіў прабой дзвярэй у падвале і такім чынам трапіў у памяшканне, адкуль і забраў карціны, якія яму падабаліся. Агульны кошт выкрадзенага складае 7 мільёнаў рублёў. Між іншым, значынца пакінуў сляды, паведамляюць у прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

ТАКІМ ШЧАСЦІЦЬ

З пятага паверха шматкватэрнага дома скокнуў 26-гадовы непрацуючы гамяльчанін пасля таго, як у нецвярозым стане пасварыўся са сваёй жонкай. Страсенне мазгоў і вывіх пляча — адносна добры вынік для «каскадзёра».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НАГАДАЛА НА... 40 МІЛЬЁНАЎ

Супрацоўнікамі сталічнай міліцыі затрымана махлярка, ахвярамі якой, паводле папярэдніх звестак, сталі 6 чалавек: нанесены гэтым людзям урон ацэньваецца на суму каля 40 мільёнаў рублёў.

Паводле звестак Упраўлення ўнутраных спраў на транспарце, напачатку 30-гадовая жанчына цыганскай нацыянальнасці «засвяцілася» ў Полацку, дзе ў канцы мінулага года аператыўнікі мясцовага аддзела ўнутраных спраў на транспарце затрымалі яе з нязначнай колькасцю наркатычнага сродку — метадону. Пад варту мясцовую жыхарку не ўзялі, таму што ў праваахоўнікаў была інфармацыя, згодна з якой, падазроная займалася сістэматычным збытам «зелля»: было вырашана працягваць у дачыненні да яе аператыўна-пошукавыя мерапрыемствы. І не дарэмна, таму што ўжо ў гэтым годзе падчас вобыску па месцы яе жыхарства ў... прыбіральні ў дварэ было знойдзена 66 скруткаў з метадонам, агульнай вагой 27 грамаў. Між іншым, напачатку падследная адмаўляла сваё дачыненне да «дурману», аднак экспертыза ўстанавіла, што на канфіскаваных поліэтыленавых пакетах прысутнічае яе геном (біялагічныя рэчывы). Апошняе і пацвердзіла прыналежнасць тавару цыганцы. Аднак затрымалі жанчыну супрацоўнікі міліцыі ў Мінску, дзе, як выявілася, зламысніца ўчыніла махлярства ў асабліва буйным памеры. Як мяркуецца, тут яна займалася, у прыватнасці, гаданнем, зняццем псоты... Устаноўлена ўжо шэсць чалавек, якія пацярпелі ад яе дзейнняў і страцілі грошы. Цяпер праваахоўнікі высвятляюць, ці мае гэтая жанчына дачыненне да іншых злачынстваў.

Ігар ГРЫШЫН.

ЯК САПРАЎДНЫЯ МУЖЧЫНЫ!

Паведамленне аб пажары ў вёсцы Старадубовая Гродзенскага раёна, прычынай якога, хутчэй за ўсё, было парушэнне правілаў эксплуатацыі печы, паступіла ў службу выратавання каля 18 гадзін. Пажарныя прыбылі на месца здарэння і лакалізавалі агонь. А гаспадара дома выратавалі суседскія хлапчукі, паведамляе прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС.

Дым, што выбіваўся праз шчыліны з хаты, першым убачыў васьмігадовы Дзяніс і пабег паведаміць аб здарэнні бацьку, трактарысту СВК «Пагранічны». А тым часам яго старэйшыя браты, 14-гадовы Яўген і 12-гадовы Уладзіслаў, кінуліся ў дом. Гаспадара, 47-гадовага непрацуючага мужчыну, знайшлі ў пакоі, выцягнулі яго і перадалі работнікам хуткай дапамогі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

АЎСЯНАЕ ЗЕРНЕ НЕ ГОРШ ЗА ТАБЛЕТКІ

Авёс валодае шматлікімі гаючымі ўласцівасцямі. З вялікай павагай ставілася да яго тыбецкая медыцына, шырока прымяняецца ён і ў гамеапатыі. У першую чаргу, трэба выдзеліць агульнаўмацавальнае дзеянне аўса — яго здаўна выкарыстоўвалі пры выходжванні хворых пасля цяжкіх лёгачных захворванняў. Авёс таксама прымянялі як мачагонны і патагонны сродак; для дзяцей, хворых на рахіт і залатуху, рабілі ванны з адвару аўсянай саломы; аўсяную муку ўжывалі пры вострых запаленнях страўніка-кішачнага тракта.

У зярнятках аўса ўтрымліваецца да 60 % крухмалу, 5—8 % тлушчу, 10—18 % бялкоў, неабходныя арганізму амінакіслоты трыптафан і лізін. Прысутнічае эфірны алей, арганічныя кіслоты, цукры, вітаміны B_1, B_2, B_6, каратін, вітамін К (нармалізуе згусальнасць крыві), нікацінавая і пантатэнавая кіслоты. Авёс багаты на макра- і мікраэлементы: у ім выяўлены жалеза, калій, магній, фосфар, крэмній, марганец, цынк, фтор, ёд і інш.

АСНОЎНЫЯ ЛЕКАВЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ АЎСА:

- хутка аднаўляе і павялічвае мышачную сілу;
- нармалізуе абмен рэчываў, дзейнасць сардэчна-сасудзістай сістэмы, эфектыўны пры цукровым дыябеце і пры высокім утрыманні халестэрыну ў крыві, папярэджвае ўтварэнне тромбаў;
- карысны для лёгкіх; пры туберкулёзе аўсяныя стравы выкарыстоўваюць як крыніцу крэмнію для лячэння і аздараўлення пасля хваробы;
- дабратворна ўздзейнічае на слізістую абалонку страўніка і кішэчніка, рэкамендуецца пры атаніі кішэчніка, метэарызме, язвавай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі, пры панкрэатыце; адвар з аўсянай мукі — пры нястраўнасці, паносах;
- выводзіць з арганізма таксічныя рэчывы;
- нармалізуе тлушчавы абмен і садзейнічае пахудзенню;
- паляпшае стан скурнага і валасянога покрыва.

НАРОДНЫЯ РЭЦЭПТЫ

- Пры захворваннях нырак як мачагонны сродак прымяняюць адвар цэльных зярнятак: 1 шклянку сыравіны кіпяцяць у 4 шклянках вады на вадзяной лазні да змяншэння аб'ёму ў два разы, дадаць 4 ст. лыжкі мёду, патрымаць на вадзяной лазні яшчэ 5 хвілін, пасля чаго прафільтраваць. Прымаць па 1/2 шклянкі 2—3 разы на дзень.
- Пры страўнікава-кішачных захворваннях: шклянку добра прамытага аўса заліць 1 л дыстыляванай вады пакаёвай тэмпературы, настойваць на працягу 10—12 гадзін. На слабым агні кіпяціць 30 хвілін пры шчыльнай накрыўцы, затым ухутаць і настойваць яшчэ 12 гадзін. Пасля адвар працадзіць і даліць дыстыляванай вадой, каб агульны аб'ём склаў 1 л. Прымаць на працягу месяца за 20—30 хвілін да яды або паміж прыёмамі ежы 3 разы на дзень па 100—150 мл.
- Пры прастудзе, якая суправаджаецца кашлем: авёс засыпаюць на 2/3 аб'ёму пасудзіны, даліваюць малаком і ставяць у духоўку. Вараць, перыядычна даліваючы малако, пакуль авёс не разварыцца, пасля чаго адціскаюць і працэджваюць. Атрыманую вадкасць п'юць па 2—3 ст. лыжкі 3 разы на дзень.
- Карысны адвар аўса і пасля перанесенага інфаркту міякарда, пры пачатковай стадыі гіпертаніі: 1 шк. аўса кіпяцяць у 1 літры вады да выпарэння паловы аб'ёму вадкасці, працэджваюць і п'юць па 1/2 шклянкі 3 разы на дзень.
- Для ўмацавання нервовай сістэмы і сэрца прымаюць кактэйль з аўса і глогу: сок глогу змешваюць з адварам аўса, дадаюць 80 г мёду на 1 л сумесі і даводзяць да кіпення. П'юць па шклянцы 3 разы на дзень за 30 хвілін да яды.
- Цукровы дыябет, атэрасклероз. Заліць 100 г аўса 3 шк. вады, даць настояцца на працягу 4—8 гадзін. Прымаць па 1/2 шклянкі 3—4 разы на дзень. Альбо можна прыгатаваць наступны збор: узяць па 2 г саломы зялёнага аўса, сушанага лісця чарніц, сушаных створак фасолі, насення лёну, усё здрабніць, пакласці ў тэрмас і заліць 1 шк. гатаванай вады. Настойваць 8 гадзін, працадзіць. Прымаць па 1—2 ст. лыжкі 3 разы на дзень.
- Пры бяссонніцы: здрабніць у мясарубцы 2 ст. лыжкі аўса, заліць 1 шклянкай гарэлкі і настойваць 15 дзён у цёмным месцы. Прымаць па 20—30 кропель 2 разы на дзень.
- Пры старэчай слабасці, хворым пасля цяжкіх аперацый рэкамендуецца наступны каларыйны напой: шклянку зярнят аўса заліць 5 шк. гарачай вады і варыць да густога кісялю, працадзіць, дадаць 4 ч. лыжкі мёду. Адвар піць цёплым па шклянцы 3 разы на дзень за гадзіну да яды.
- Пры рахіце і залатусе ў дзяцей, а таксама пры рэўматызме, падагры, артрыце: 1 кг здробненай аўсянай саломы заліце 5 л вады і кіпяціце 30 хвілін. Атрыманы адвар працадзіце і выліце ў ванну з тэмпературай вады 37—38 градусаў. Працягласць працэдуры 10—15 хвілін. Курс — 2—3 ванны на тыдзень.
- Пра атлусценні, атэрасклерозе і цукровым дыябеце рэкамендуюцца аўсяныя разгрузачныя дні (1—2 разы на тыдзень): пяць разоў на дзень з'ядаць па 140 грамаў аўсянай кашы, звараной на вадзе, плюс 1—2 шклянкі несалодкай гарбаты або адвару шыпшыны.

АЎСЯНЫ КІСЕЛЬ

Аўсяны кісель — гэта і дзіцячае харчаванне, якое ў сотню разоў больш карыснае і бяспечнае, чым любая імпартная сумесь, і першая ежа пасля цяжкай хваробы, і лякарства, і шмат што яшчэ. За мяжой аўсяны кісель заўсёды называлі не інакш, як «рускі бальзам». І нездарма. Вельмі ж шырокі спектр прафілактычнага і лекавага дзеяння аўсянага кісялю. З'яўляючыся своеасаблівым прыродным біястымулятарам, ён запаволівае працэсы старэння, павышае жыццёвы тонус арганізма, умацоўвае імунітэт і садзейнічае даўгалеццю.

Чаму яго назвалі «кісялём»? Аўсяны кісель заўсёды быў кіслым. Гэта прадукт кісламалочнага браджэння. Менавіта ў працэсе браджэння кісель набывае ўсе свае цудадзейныя ўласцівасці. Прыгатаваць сапраўдны аўсяны кісель у хатніх умовах зусім не складана.

Усыпце ў 3-літровы слоік 1,5 шклянкі цэльных аўсяных круп, уліце 2 літры цёплай гатаванай вады, дадайце 50—70 г кефіру. Усё перамяшайце і накрыйце марляй, пастаўце для браджэння ў цёплае месца на 1,5—2 сутак. Пасля таго, як браджэнне спыніцца, працадзіце сумесь праз дзве-тры сталкі марлі ў іншы слоік і пастаўце адстойвацца на суткі ў халадзільнік. Праз суткі ў вашым слоіку зверху будзе паўпразрыстая вадкасць, а знізу — белы асадак. Верхнюю вадкасць трэба акуратна зліць. Тая белая вадкасць, якая застанецца, і будзе асновай кісялю. Яе захоўваюць у халадзільніку. Для прыгатавання кісялю трэба ўзяць гэту вадкасць і разбавіць яе вадой у суадносінах 1:2 або 1:3 (выбірайце на смак), паставіць на агонь, давесці да кіпення. Кісель гатовы. Можна дадаць мёд або масла на смак.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

НАЙЛЕПШЫ РЭДАКТАР ТЭЛЕКАНАЛА СТБ:

«МАЯ КАР'ЕРА ПАЧЫНАЛАСЯ З ГРУЗЧЫКА»

ЧАМУ ў карыстальнікаў інтэрнэту вялікай папулярнасцю карыстаюцца парнаграфічныя рэсурсы? Чаму сучасныя наведвальнікі глабальнага сеціва падкія на «жоўтыя» сенсацыі, а не на сур'ёзныя артыкулы?
Уладзімір КАЗАНКОЎ, адзін з найлепшых інтэрнэт-рэдактараў краіны, распавёў «Звяздзе», як можна выхаваць пачуццё густу ў беларускіх інтэрнэт-карыстальнікаў.

Уладзімір Казанкоў падымае рэйтынгі газетных і тэлевізійных сайтаў краіны ў разы. А ў 2009 годзе яго прызналі найлепшым рэдактарам тэлеканала СТБ, інтэрнэт-старонка якога стала лідарам беларускіх тэлевізійных інтэрнэт-рэсурсаў.

Пытаюся ў рэдактара, колькі гадоў ён вывучае інтэрнэт.

— Насамрэч першы камп'ютар я набыў на апошніх курсах універсітэта. А ў свой час увогуле збіраўся пайсці вучыцца на міліцыянера.

— Няўжо?

— Рэч у тым, што бацька мой служыў у марскім флоце, і нарадзіўся я ў Баку, вучыўся ў мясцовай школе. Потым сям'я пераехала ў Крым, дзе я жыў доўгі час і скончыў звычайную сярэднюю школу. Там і збіраўся паступаць на міліцыянера.

— Чаму гэтага не адбылося?

— Я добра здаў усе псіхалагічныя тэсты, фізічную падрыхтоўку, але запрашэнне здаваць экзамены да мяне не прыйшло.

— Як ты апынуўся ў Беларусі?

— Я этнічны беларус, і мы вярнуліся на гістарычную Бацькаўшчыну, у Чачэрск. Праз год знаёмая прапанавала ехаць у Мінск здаваць экзамены. Яна дала мне кніжку «Зборнік ВНУ», і высветлілася, што на журфак БДУ трэба здаваць амаль такія ж экзамены, як на міліцыянера ва Украіне. Але для факультэта журналістыкі патрэбныя артыкулы. Я пайшоў у газету «Чачэрскі веснік» і напісаў лірычную замалёўку пад назвай «У прыродзе ўсё гарманічна», а пасля яшчэ некалькі нататак. Цяпер да паступлення на журфак усё было гатова. І ў мяне атрымалася, пытанні на іспытах трапіліся тыя, якія я добра ведаў.

«Мой першы інтэрнэт-сайт быў пра начное жыццё ў Мінску»

— Ступендыю выплачвалі ў памеры 20 тысяч рублёў (каля 10 долараў на той час). Хапала яе на тыдзень. Вопратка ў мяне таксама была старая, хадзіў у чаравіках і трэніках, аднагрупнікі пасмейваліся, але я асабліва не пераймаўся. Па праграме ва ўніверсітэце таксама паспяваў з цяжкасцю. Першынаперш не ведаў беларускай мовы, але быў энтузіязм, і ў выніку вельмі хутка нацыянальную мову вывучыў. У выніку атрымаў за выніковы тэст 8 балаў (з гэтага моманту гутаркі Уладзімір Казанкоў перайшоў на беларускую мову. — **Аўт.**).

— Ты адзін з першых паспяховых раскруткыкаў інтэрнэт-СМІ ў Беларусі? З хлопцам, які збіраўся пайсці ў міліцыю, гэта не вяжацца.

— Да інтэрнэту я прыйшоў не адразу. Спачатку ў студэнцкія гады працаваў на рынку «Ждановічы» грузчыкам. Так зарабіў 400 долараў і набыў першы камп'ютар, які пацяжу асвойваў, выкарыстоўваючы інфармацыю з інтэрнэту. Паралельна з навучаннем падпрацоўваў будаўніком. Аднойчы вяртаўся ў студэнцкі інтэрнат з Фаніпаля, дзе будавалі катэдж, і раптам зразумеў — хопіць, прыйшоў час зарабляць грошы галавой, раз ужо вучуся ў галоўнай ВНУ краіны.

— У тыя часы людзі ўвогуле цьмяна разумелі, што такое інтэрнэт. Чаму ты вырашыў працаваць у гэтай сферы?

— Непасрэднае напісанне артыкулаў у газеты не надта мяне вабіла, адпіскі рабіць не хацелася. За сур'ёзныя матэрыялы ў шмат якіх газетах мала плацяць. Я вырашыў пайсці іншым шляхам, стварыў свой СМІ ў інтэрнэце — сайт пра начное жыццё ў Мінску. Наведваў вечарыны ў сталічных клубах, пісаў з іх рэпсэнзіі, знайшоў фатографафу, якія бясплатна рабілі здымкі. Наведвальнікам вечарынаў раздаваў візітоўкі з надпісам «Вашы фотаздымкі ў інтэрнэце». Гэтак жа я пазней пераключыўся на канцэрты. Наведвальнасць сайта вырасла да 1000 чалавек за суткі, што на той час было нямала. Аднак праект перастаў быць для мяне цікавым, і я зрабіў іншы сайт — усё пра Італію: нерухомасць, туры, людзі. Афарміў дакументы на індывідуальнага прадпрымальніка, што-ніштo зарабляў рэкламай, якую давалі на гэты сайт. Дзякуючы гэтым праектам, я навучыўся прыцягваць аўдыторыю, рабіць дызайн. Пазней зразумеў, што хачу працаваць менавіта з інтэрнэт-версіямі вядомых сродкаў масавай інфармацыі. Размясціў аб'яву ў інтэрнэце, праца знайшлася за адзін дзень — запрасілі ў газету «Комсомольская правда» в Беларуси».

Калі знікнуць папяровыя газеты?

—Літаральна праз некалькі месяцаў я быў прызначаны загадчыкам інтэрнэт-аддзела, наведвальнасць сайта пачала хутка расці. У выніку за паўтара года ўдалося раскруціць рэсурс у чатыры разы — з 5000 наведвальнікаў за суткі да 20000. «Камсамолка» на той час займала першае месца сярод усіх інфармацыйных сайтаў краіны. Праўда, развіваць такія праекты не надта складана. У выданні шмат расійскіх матэрыялаў, працуе вялікая каманда журналістаў. Тым не менш, мяне цікавіла праца з сур'ёзнымі, сацыяльнымі матэрыяламі. Таму, калі я даведаўся, што ў аддзеле інтэрнэт-вяшчання тэлеканала СТБ ёсць вакансія, пайшоў туды працаваць. На той час сайт СТБ меў невысокія рэйтынгі — 500-700 наведвальнікаў за суткі.

— Наколькі я ведаю, цяпер сайт «Сталічнага тэлебачання» больш рэйтынгавы за інтэрнэт-старонку «АНТ»...

— Цяпер нас наведвае прыкладна 5000 чалавек за суткі. Калі з'яўляюцца нейкія «выбуховыя» матэрыялы, то да 10000 чалавек. Найперш мы пачалі дагаджаць людзям, адказваць на ўсе пытанні, якія задаваліся праз форум. Выстаўляць на сайт усе цікавыя перадачы. Зрабілі забаўляльныя праекты. Напрыклад, людзі дасылаюць нам фотаздымкі з дзецьмі, і пра пераможцаў мы здымаем сюжэты. Зрабілі блогі вядучых. Навіны пачалі выстаўляць як мага больш аператыўна. Афармляць іх сталі згодна з найноўшымі сусветнымі тэхналогіямі. Урэшце мы наладзілі супрацоўніцтва з найлепшымі пошукавымі службамі. Ды і кіраўнік дырэкцыі спецпраектаў тэлеканала Генадзь Салдатаў спрыяў развіццю сайта.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Уладзімір Казанкоў, 27 гадоў, жанаты. Адзін з першых і самых паспяховых беларускіх інтэрнэт-рэдактараў.
Сёлета рыхтуе да абароны кандыдацкую дысертацыю на тэму «Палітычная культура журналіста і інфармацыйная бяспека ў грамадстве».
Выкладчык кафедры сацыялогіі журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ.
Загадчык аддзела інтэрнэт-вяшчання тэлеканала «Сталічнае тэлебачанне». Прызнаны найлепшым рэдактарам тэлеканала за 2009 год.

— Выходзіць, калі Інстытут журналістыкі БДУ падрыхтуе такіх жа інтэрнэт-спецыялістаў, як ты, то яны выціснуць папяровыя выданні з рынку?

— Смерці друкаваных СМІ пакуль не прадбачыцца. З'явіліся спецыялізаваныя выданні, якія карыстаюцца попытам. Калі інфармацыйныя друкаваныя СМІ памруць, то аналітычныя будуць жыць. Нават мне не заўсёды хочацца глядзець у ноўтбук і ламаць вочы. Друкаваныя выданні чытаць куды больш прыемна.

— Якія інтэрнэт-праекты раскруціць лягчэй за ўсё?

— У інтэрнэце шмат лянівых людзей, большасць цікавяцца рэфератамі, парнаграфіяй і бясплатнай музыкай. У інтэрнэце чалавек пераўтвараецца ў ананіма. І калі фактар ананімнасці спалучаецца, скажам, з «жоўтымі» сенсацыямі, то гэта сапраўдная бомба. Часта на сайты такія матэрыялы выстаўляюцца пад маскай задавальнення попыту чытачоў. Дык калі чалавек, скажам, педафіл, што, яго цікаўнасць неабходна задавальняць? Найперш неабходна выхаваць у людзях густы.

— Беларускую журналістыку многія крытыкуюць, маўляў, адстае ад узроўню заходнееўрапейскай, расійскай, украінскай. Як рэанімаваць нашы СМІ?

— На мой погляд, гэта меркаванне вельмі эмацыйнае — але праблема ёсць. Датычыцца яна не толькі Беларусі, але і, напрыклад, Вялікабрытаніі. Па звестках даследчай кампаніі GFK Group, паказчык даверу да СМІ з боку насельніцтва там не большы за 17 %.

Праблема ў тым, што ў сучасных газетах мала аналітычных матэрыялаў. Рыхтаваць іх вельмі складана, а плацяць за такую працу не заўсёды адэкватна. Таму для газет характэрна інфармацыйная хваля, якая ў тым ліку звязана з нізкім узроўнем палітычнай культуры. Навуковая дысертацыя, якую я рыхтую, якраз закранае гэта пытанне. Часта журналісты не бачаць цэлай карцінкі, вырываюць словы чыноўнікаў з кантэксту, і тыя выглядаюць недарэчна. Журналісты часта не ведаюць, чые інтарэсы яны адстойваюць, не разумеюць, што журналістыка павінна абслугоўваць грамадзян, а не асобных бізнэсменаў альбо чыноўнікаў. Важна, каб у нас нарэшце з'явіліся штодзённыя аналітычныя інтэрнэт-СМІ, якія былі б арыентаваныя выключна на інтарэсы грамадзян.

Каб маладыя журналісты дакладна вызначалі, якія інтарэсы стаяць за тым ці іншым СМІ, у Інстытуце журналістыкі БДУ пад кіраўніцтвам Васіля Вараб'ёва чытаюцца курсы па так званай медыядакацыі.

Будучыня ў беларускай журналістыкі ёсць.

Гутарыў Яўген ВАЛОШЫН.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.02	16.44	8.42
Віцебск —	8.56	16.29	7.33
Магілёў —	7.52	16.35	8.43
Гомель —	7.42	16.37	8.55
Гродна —	8.16	17.00	8.44
Брэст —	8.11	17.07	8.56

Месяц

Поўня 30 студзеня.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Максіма, Пятра.*
К. *Ганны, Валерыя, Здзіслава, Зянона, Міхала, Францішка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

29 студзеня

1884 год — нарадзіўся Антон Іванавіч Луцкевіч, беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, гісторык, публіцыст, літаратурны крытык. З 1906 года ў Вільні выдаваў газеты «Наша доля», «Наша ніва». У друку выступаў пад псеўданімам Антон Навіна. У 1921 годзе ўзначальваў Беларускі нацыянальны камітэт, заснаваў Беларускую школьную раду, якая пазней злілася з Таварыствам беларускай школы. Выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі. У 1927 годзе арыштаваны польскімі ўладамі, судом апраўданы. Адзін са стваральнікаў Цэнтральнага саюза культурных і гаспадарчых арганізацый — грамадска-палітычнай арганізацыі беларускага нацыянальнага руху правацэнтрысцкага напрамку ў Заходняй Беларусі. Напачатку 1930-х гг. адышоў ад палітычнай дзейнасці, працаваў у Беларускім музеі, выступаў з лекцыямі. Аўтар кніг, брашур, артыкулаў па гісторыі Беларусі, беларускаму правапісу, гісторыі беларускага адраджэння, літаратурна-крытычных артыкулаў.

1886 год — нямецкі інжынер, піянер аўтамабілебудавання Карл Бенц запатэнтаваў аўтамабіль на бензінавым рухавіку.

Цытата дня:

«Заўсёды трымай меру і ў словах, і ў маўчанні».

Публій Сір (I ст.), старажытнарымскі паэт.

ЦУДАДЗЕЙНАЯ ВАДА

Уяўленні аб цудадзейнасці вады ўзніклі ў свядомасці нашых продкаў хутчэй за ўсё дзякуючы яе прыродным якасцям: свежасці, празрыстасці, здольнасці ачышчаць чалавека як фізічна, так і энергетычна.

- Стаўленне да вады цалкам абапіралася на цэласную карціну свету, на ўсю складаную сістэму светапоглядных уяўленняў. Статус вады, яе характарыстыкі і, адпаведна, стаўленне да яе чалавека прадвызначаліся месцам яе знаходжання і той добрай або дрэннай славай, якая за ім замацавалася.
- Шматлікія помнікі пісьменнасці сведчаць, што старажытныя славяне з асаблівай пачцівасцю ставіліся да крыніц — месца самастойнага выхаду вады на паверхню зямлі. Тое месца, дзе пачынала «звінець» вада, ачышчалі ад смецця і буралому, ставілі невялічкія агароджы, маркіравалі апазнавальнымі знакамі. Пазней гэтым знакам стаў крыж, на які павязвалі ручнік, і гэта месца станавілася месцам маленняў, сустрэч, выканання рытуальных дзеянняў.
- Каб збылося пажаданне або знікла старая хвароба, вадзе прыносілі ахвяру — манету або іншыя рэчы; у некаторых выпадках на галінкі дрэва каля крыніцы мацавалі невялічкі кавалак тканіны або пояс. Да крыніцы прыходзілі маладыя, каб прамовіць малітву вернасці, каб заручыцца падтрымкай святога месца, каб іх сумеснае жыццё было такім жа светлым, чыстым, як крынічная вада. Да крыніцы прыносілі немаўлятка, каб далучыць яго да жыццёвай ручаіны роду. Каля крыніцы воіны прысягалі на вернасць роднаму краю і бралі з сабой «жывую» ваду, якая, верылі, уратуе на полі бою, а калі што, загоіць раны.
- Асаблівай пашанай у народным асяроддзі карысталіся праяўленыя абразы, а таксама тыя мясціны (дрэва, бераг ракі, крыніца, узгорак), дзе яны былі знойдзены. Як правіла, у тых месцах будавалі капліцы і нават храмы, як, напрыклад, у в. Жыровічы Слонімскага раёна. Там жа, непадалёку адна ад адной, б'юць тры крыніцы, вада ў якіх лічыцца цудадзейнай. Вобраз Багародзіцы або якіх-небудзь святых, адлюстраваных на праяўленых абразах, становіцца апекуном гэтай мясцовасці.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Нам хацелася б звярнуцца да нашых паважаных чытачоў: калі ласка, напішыце нам на адрас рэдакцыі пра крынічку (а можа быць, пра камяні-следавікі, крыжы, свяшчэнныя дрэвы, пагоркі), якія ёсць у вашай мясцовасці, пра тыя цуды, якія адбываюцца з іх удзелам, і разам мы складзём «АТЛАС СВЯТЫХ МЯСЦІНАЎ НАШАЙ РАДЗІМЫ». Мы, у сваю чаргу, абяцаем абавязкова прыехаць да вас у госці і расказаць пра ваша «святое» месца на старонках перыядычнага друку.

Усміхнемся!

Калі вы прыехалі з камандзіроўкі, а кватэра чыста прыбраная, дзеці робяць урокі, жонка гатуе, цешча вяжа, а сабака спакойна спіць на сваім месцы — яны зламалі ваш камп'ютар!!!

☺

Дыялогі ў сеціве.

— Са-аша, прымусь мяне вучыць, я сама не магу...

— Не вучы! Навошта вучыць? Прыбіральшчыцы таксама патрэбныя :)

☺

Дасведчаны падмаскоўны ляснік ведае да 10 рыфмаў на слова «Ауу».

☺

— Вашы дзеці — як кветкі ўвесну.

— О, дзякуй.

— Распусціліся, мярзотнікі!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілё